ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 21 (4273)
Аўторак, 26 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Праграму пабудовы сацыялізму ў масы. Я. ІВ.—Павялічэньне ў складзе партарганізацыі рабочых—важнейшая задача ўнутрыпартыйнага будаўніцтва. (2 стар.).

Выступленьне т. КАГАНОВІЧА на Маскоўскай абласной і гарадзкой партканфэрэнцыі (1 стар.).

XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б. Дзеньнік зьезду. Вячэрняе пасяджэньне 24 студзеня, раніцняе пасяджэньне 25 студзеня. Прывітаньне Рэвваенсавету і яго кіраўніку тав. ВАРАШЫЛАВУ (1 стар.).

Байцы Чырвонай арміі, рабочыя і калгасьнікі вітаюць зьезд (2 стар.).

Прамова тав. ГАЛАДЗЕДА на менскай партканфэрэнцыі (3 стар.).

Агляд друку (3 стар.).

КІТАЙ—Пагроза акупацыі Шанхаю.

ГІШПАНІЯ ў агні рэвалюцыйных баёў.

ПРАГРАМУ ПАБУДОВЫ САЦЫЯЛІЗМУ—У МАСЫ!

Апублікаваныя ў «Праўдзе» ад 22 студзеня дырэктывы па складаньні другога пяцігадовага пляну прадстаўляюць сабой гістарычнай важнасьці дакумант.

Цэнтральнай гаспадарчай задачай партыі і надыходзячай пяцігодкі зьяўляецца поўнае завяршэньне рэканструкцыі народнай гаспадаркі, «стварэньне навейшай тэхнічнай базы для ўсіх галін народнай гаспадаркі».

Партыя набліжаецца да XVII партканфэрэнцыі. Параўнальна невялікі адрэзак часу аддзяляе нас ад XIV партканфэрэнцыі, якая зацьвердзіла першы пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі. Але які грандыёзны этап будаўніцтва і барацьбы пройдзены ленінскай партыяй! Якія слаўныя перамогі, што маюць велізарнае гістарычнае значэньне, атрыманы пралетарыятам Савецкага Саюзу!

Ва ўсіх кутках нашай неасяжнай краіны ідзе найвялікшая сацыялістычная будоўля. Мільёны пралетарыяў і калгасьнікаў, ахопленыя вытворчым энтузіязмам, бяруць адну за другой «непрыступныя» крэпасьці. Марксыцка-ленінскі аналіз сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва, расстаноўкі клясавых сіл у краіне дазваляе зрабіць вывад, што ў другой пяцігодцы нам удасца выканаць велізарнейшы плян пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Тэорыя разьвіцьця, ужытая заснавальнікамі марксызму «да будучага разьвіцьця, будучага камунізму», ленінская тэорыя аб магчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне пераўтвараюцца штодзённа ў жыцьцё. Ва ўпартай барацьбе з клясавымі ворагамі і іх агентамі — правымі і «левымі» апартуністамі — мы з посьпехамі будуем сацыялістычнае грамадзтва.

Сацыялізм ня «музыка будучага», як сьцьвярджалі і сьцьвярджаюць апартуністы ўсіх масьцей. Мы завяршылі ў мінулым годзе пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі і да канца другой пяцігодкі скончым пабудову сацыялістычнага грамадзтва.

Бліжэйшае пяцігодзьдзе—найвялікшая гістарычная эпоха чалавецтва. Яно ўцягне ў актыўную барацьбу за сацыялістычнае будаўніцтва новыя дзесяткі мільёнаў працоўных, ператворыць іх працу ў справу гонару, адвагі і геройства. Новыя дзесяткі мільёнаў байцоў за сацыялізм будуць сьвядома зьмяняць сьвет, перавыхоўваючы самых сябе, ліквідуючы клясы ў краіне. «Асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія нараджаюць клясавыя розьніцы і эксплёатацыю, і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго сьвядомага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бяскляснага сацыялістычнага грамадзтва». (Тэзісы да XVII партканфэрэнцыі па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава).

Ужо ў 1932-33 годзе будуць у асноўным завершаны суцэльная калектывізацыя сельскай гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва. Суіснаваньне розных формаў вытворчасьці ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы канчаткова зьнішчыцца. Пралетарская дзяржава канчаткова кіне базавацца «сацыялістычнае будаўніцтва на дзьвюх розных асновах». Стратэгічны плян разгортваньня калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, намечаны тав. Сталіным у 1928 г., будзе ў асноўным выканан. А аднатыпнасьць у грамадзкіх формах вытворчасьці ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы дасьць новы гіганцкі скачок у тэмпах пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў мінулым годзе кардынальна зьмяніла склад носьбітаў розных грамадзка-эканамічных укладаў — у Савецкім Саюзе.

Калгаснае сялянства — цэнтральная фігура земляробства. Першая пяцігодка — такі вынік нашай барацьбы — канчаткова падрывае самыя глыбокія карэньні капіталізму ў вёсцы. Зьнікае база, якая нараджала кожны дзень і кожную гадзіну капіталізм, — раздробленая, самая дробная сялянская гаспадарка. Гэта значыць, што і капіталістычныя элемэнты ў горадзе трацяць глебу, што у нас ёсьць усё неабходнае для ліквідацыі клясаў і завяршэньня пабудовы сацыялістычнага грамадзтва ў другую пяцігодку.

Поўная ліквідацыя эксплёататарскіх элемэнтаў, якія захаваліся яшчэ ў нашай эканоміцы, азначае, што канчаткова закрываецца «магчымасьць для аднаго грамадзкага пласта скінуць з сябе і ўскласьці на другі грамадзкі пласт натуральную неабходнасьць працы» (Маркс). Праца стане ўсеагульнай і будзе размяркоўвацца паміж усімі працаздольнымі членамі грамадзтва. Канчаткова будзе зьнішчана магчымасьць эксплёатацыі аднаго чалавека другім. Але яшчэ захаваюцца рэшткі «буржуазнага права», паколькі прадукты вытворчасьці будуць разьмяркоўвацца паводле колькасьці і якасьці патрачанай працы. Дробнабуржуазная ўраўнілаўка і абязьлічка будуць па-ранейшаму пад агнём бальшавіцкай самакрытыкі ў другой пяцігодцы.

Грандыёзны плян работ намячаецца ЦК партыі на другую пяцігодку (1933-1937 г. г.). Асновай асноў нашай барацьбы за скончаньне пабудовы сацыялістычнага грамадзтва к канцу другой пяцігодкі зьяўляецца савецкае машынабудаўніцтва. На гэтым складанейшым участку, дзе мы ўсё яшчэ моцна адстаем, вырашаецца задача «дагнаць і перагнаць», вырашаецца пытаньне аб вызваленьні Савецкага Саюзу ад замежнай залежнасьці ў тэхніка-эканамічных адносінах.

Пад канец другой пяцігодкі, каб забясьпечыць усе патрэбнасьці рэканструкцыі прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, сувязі і г. д., прадукцыя савецкага машынабудаўніцтва павінна быць у тры, у тры з паловай разы вышэй, чым у 1932 годзе. Выкананьне гэтай праграмы ў галіне машынабудаўніцтва забясьпечвае тое, што ў другой пяцігодцы СССР зойме першае месца ў Эўропе ў тэхнічных адносінах.

«Важнейшым элемэнтам тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі,—як справядліва адзначаецца ў тэзісах да партканфэрэнцыі, ухваленых у асноўным Палітбюро ЦК,—зьяўляецца стварэньне навейшай энэргетычнай базы, заснаванай на найшырэйшай электрыфікацыі прамысловасьці і транспарту...» 100 мільярдаў кілёват гадзін электраэнэргіі ў 1937 годзе, супроць 17 мільярдаў у 1932 годзе. Павялічэньне здабычы нафты ў два з паловай, тры разы пад канец другой пяцігодкі. Амаль патраеньне здабычы вугалю ў параўнаньні з 1932 годам. Такава бальшавіцкая праграма стварэньня новай энэргетычнай базы.

Праграма па чорнай мэталюргіі зыходзіць з выплаўкі ў 1937 г. ня менш 22 млн. тон чыгуну і неабходнай колькасьці якасных сталяй для нашага машынабудаўніцтва. Гэта патрабуе пабудовы новых буйных заводаў, рэканструкцыі чорнай мэталюргіі.

Вялікая ўвага аддаецца ў другой пяцігодцы каляровай мэталюргіі. У перадавыя шэрэнгі выйдуць хэмічная прамысловасьць і чыгунны транспарт. Краіна пакрыецца густой сеткай новых чыгунак агульнай даўжынёй у 25-30 тысяч кілёмэтраў.

Лінія партыі на далейшае паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў працоўных знаходзіць сваё адлюстраваньне ў грандыёзнай праграме росту лёгкай і харчовай індустрыі. Да канца другой пяцігодкі забесьпячэньне насельніцтва асноўнымі спажывецкімі таварамі і ў тым ліку прадуктамі харчаваньня павялічыцца ў два-тры разы супроць канца першай пяцігодкі.

Праграма работ у галіне прамысловасьці і транспарту, па вучастку вырабу хэмічных угнаеньняў і г. д. забясьпечвае поўнае завяршэньне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Машынна-трактарныя станцыі цесным кольцам ахопяць усе калгасы Савецкага Саюзу і завершаць у асноўным мэханізацыю сельскай гаспадаркі.

Праграма другой пяцігодкі грандыёзная. Яна намячае тэмпы будаўніцтва, нячуваныя ў гісторыі чалавецтва. Але гэтыя тэмпы дыктуюцца ўсёй міжнароднай абстаноўкай, задачай, указанай т. Сталіным—«дагнаць і перагнаць» максымум за дзесяць год. Гістарычны плян пабудовы сацыялістычнага грамадзтва — генэральная лінія нашай партыі. Поўнае выкананьне народна-гаспадарчага пляну бягучага году на аснове рашучага праводжаньня 6 умоў тав. Сталіна — прадпасылка да пабудовы ў другой пяцігодцы сацыялістычнага грамадзтва. Задача ўсіх партарганізацый — мабілізаваць масы на бальшавіцкую барацьбу за тэмпы і якасьць апошняга году пяцігодкі.

Партыя, як і да гэтага часу, з ленінскай непрымірымасьцю будзе біцца за пабудову сацыялістычнага грамадзтва ў нашай краіне, за выкананьне ў тэрмін пляну другой пяцігодкі. Перавыхаваньне мільёнаў патрабуе яшчэ большага ўзмацненьня клясавай пільнасьці на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Спробы правых і «левых» апартуністаў сарваць справу пабудовы сацыялізму сустрэнуць з боку мільёнаў самы жорсткі адпор.

Савецкі Саюз усё больш становіцца «цэнтрам прыцягваньня рабочых усіх краін і прыгнечаных усяго сьвету». Працоўныя ўсіх краін усё больш бачаць прынцыповую розьніцу дзьвёх сыстэм гаспадаркі.

Рэвалюцыйныя рабочыя ўсіх краін акружаюць клопатамі Савецкі Саюз і гатовы абараняць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну. Сілы сусьветнага Кастрычніка растуць. Б'е гадзіна капіталістычнай прыватнай уласнасьці ва ўсім сьвеце. Мільёны пралетарыяў і калгасьнікаў нашай краіны рыхтуюцца праводзіць у жыцьцё дырэктывы ленінскага ЦК аб другой пяцігодцы («Праўда»).

XIV зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

24 студзеня. Вячэрняе пасяджэньне

Тав. Галадзед адкрывае вячэрняе пасяджэньне зьезду.

Тав. Шарангович працягвае справаздачу ЦК, падрабязна спыняецца на пытаньнях перабудовы партыйнай работы па пытаньнях с-г. вытворчасьці на перанясеньне цяжару партыйна-масавай работы ў цэх, агрэгат, брыгаду і потым пераходзіць да аналізу работы вайсковых партыйных арганізацый.

— Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту і ПУР'у вайсковыя партарганізацыі да XIV зьезду КП(б)Б прыйшлі з радам рашаючых посьпехаў на фронце аўладаньня тэхнікай павышэньня баяздольнасьці часьцей, аўладаньня мэтадамі і формамі сучаснага бою. Вайсковыя партарганізацыі, высока трымаючы сьцяг Леніна, бязьлітасна змагаючыся з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, прыйшлі да XIV зьезду і да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі маналітнымі баяздольнымі арганізацыямі.

— Задача заключаецца ў тым,—гаворыць тав. Шарангович аб камсамольскай арганізацыі — каб палепшыць партыйнае кіраўніцтва камсамолам, накіраваць энэргію і сілы маладога пакаленьня на выкананьне гістарычных задач будаўніцтва сацыялізму, на завяршэньне пяцігодкі ў 1932 годзе.

— Партарганізацыі, абгаворваючы і рэалізоўваючы ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция»,—падкрэсьлівае тав. Шарангович—яшчэ больш узьнялі сваю бальшавіцкую пільнасьць і непрымірымасьць да контр-рэвалюцыйнага трацкізму і апартунізму. Абгаварэньне ліста дало магчымасьць выкрыць трацкісцкіх кантрабандыстаў, якія праз фальсыфікацыю гісторыі партыі імкнуліся пашырыць ідэі контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Выкрыт і выключан з партыі трацкісцкі кантрабандыст Югаў, які, карыстаючыся лібэралізмам асобных камуністаў, праз нашы часопісі фальсыфікаваў гісторыю нашай партыі, узводзіў на яе нячуваныя паклёны.

Тав. Шарангович ставіць рад задач па павышэньні марксыцка-ленінскага выхаваньня кіруючых партыйных кадраў і ўсіх членаў і кандыдатаў партыі.

— Маналітна згуртаванай, загартаванай у баёх з клясавым ворагам, — заканчвае тав. Шарангович, — наша партыя прыйшла да свайго XIV зьезду і пад сьцягам Леніна, пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. Сталіна прыйдзе да новых рашаючых перамог па шляху будаўніцтва сацыялізму.

Са справаздачнай рэвізійнай камісіі выступіў тав. Клімковіч.

* Зьезд бурнымі і працяглымі воплескамі сустракае дэлегацыю №-скага палка, якая ў залю ўваходзіць з баявымі сьцягамі пад гукі аркестру.

— XIV зьезду бальшавікоў Беларусі ад чырвонаармейскага, камандзірскага і палітычнага складу палка,—гаворыць тав. Крывашэін, — гарачае прывітаньне.

Цьвёрдае праводжаньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, дае на фронце індустрыялізацыі адну за другой вялікія перамогі. Мы з посьпехам выконваем пяцігодку і выканаем яе за чатыры гады. Рост індустрыялізацыі нашай краіны стварае магутную базу для ўзросту баяздольнасьці часьцей Чырвонай арміі.

Задача нашага палка на палёх барацьбы ў выпадку нападу на нас ворага захаваць традыцыі чырвонай конніцы, упісаць новыя старонкі перамог у гісторыю барацьбы за сацыялізм.

Тав. Крывашэін рапартуе аб выдатных і колькасных паказьніках баявой падрыхтоўкі палка.

— Спробы капіталістычных дзяржаў зацягнуць нас вайной—заключае прамоўца—разаб'юцца аб сталь нашых машын, аб непахісную магутнасьць сталёвых радоў Чырвонай арміі.

* На вячэрнім пасяджэньні пачаліся спрэчкі па справаздачы ЦК. Выказаліся т. т. Бліноўская (зав. «Полымя рэвалюцыі»), Бэрзін (Белбюро ЦК чыгуначнікаў), Аранштам (Палітупраўленьне БВА), Хлявіцкі (Асіпсторф).

Прамоўцы, ухваляючы палітычную лінію ЦК, падкрэсьліваючы велізарныя перамогі, якія атрымала КП(б)Б у непрымірымай барацьбе з клясавымі ворагамі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у барацьбе за адзінства ленінскай партыі, спыняліся на пытаньнях распрацоўкі другой пяцігодкі, умацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Тав. Бэрзін, характарызуючы работу транспарту, падаў дзесяткі прыкладаў гераічнай барацьбы чыгуначнікаў за здаровы паравоз, за ажыцьцяўленьне спаранай язды, за павялічэньне нагрузкі і выгрузкі, поўную нагрузку паравоза і вагона.

Самарская вітае зьезд.

— Чыгуначнікі Аршанскага і Жлобінскага вузлоў, — гаворыць тав. Бэрзін, — паказалі сапраўды баявыя бальшавіцкія тэмпы работы па ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна на транспарце. Аршанскія і жлобінскія чыгуначнікі да XIV зьезду партыі прыйшлі з радам посьпехаў па ліквідацыі адставаньня транспарту ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

* На трыбуне дыспэтчар т. Грыцалевіч.

— Мы рапартуем XIV зьезду аб новых перамогах у барацьбе за здаровы паравоз, за ажыцьцяўленьне спаранай язды, за ліквідацыю адставаньня транспарту ад тэмпаў разьвіцьця ўсёй народнай гаспадаркі.

На трыбуне адзін за адным зьмяняюцца прадстаўнікі заводаў і фабрык, рапартуюць зьезду аб сваіх перамогах на выкананьні пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі, аб гатоўнасьці змагацца і з гонарам выканаць пляны 4-га, завяршальнага году пяцігодкі.

* Зьезд выслухаў прывітаньні рабочых дэлегацый фабрыкі «Кастрычнік», машына-будаўнічага заводу «Камунар», заводу «Бальшавік», Менскага атраду Асоавіяхіму і паравозьнікаў Аршанскага чыгуначнага вузла.

* Зьезд бурнымі і працяглымі воплескамі сустракае паведамленьне тав. Багданава аб тым, што ст. Ворша ва ўсесаюзным конкурсе на лепшае праводжаньне спаранай язды заняла адно з першых месц.

* Тав. Дзямідовіч, прадстаўнік польскага нацыянальнага калгасу «Чырвоны Камунар», перадае зьезду бальшавіцкае прывітаньне ад працоўных мас палякаў, якія аб'яднаны ў калгасах Плешчаніцкага раёну і пад кіраўніцтвам партыі прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

— Наш калгас з гонарам выканаў — гаворыць тав. Дзямідовіч, — усе абавязкі перад пралетарскай дзяржавай.

Заля зьезду напаўняецца дэлегатамі-прадстаўнікамі №-кавалерыйскай дывізіі. У рад выстройваюцца фанфарысты. Баявыя ганаровыя сьцягі кавалерыйскай дывізіі ахоўваюцца ўзброеным караулам. У напружанай цішыні гучыць голас:

— Дэлегацыя №-скай кавалерыйскай дывізіі пад штандары свабоды...

Зважай!

Фанфарысты граюць «прывыў».

* На трыбуне прадстаўнік кавалерыйскай дывізіі тав. Заслаўскі. Заля доўгімі і гучнымі воплескамі сустракае словы тав. Заслаўскага аб тым, што Чырвоная армія ў выпадку нападу на нас ворага адрэжа ўсякія подступы ворага да граніц Савецкага Саюзу.

* Зьезд вітала дэлегацыя пяхотных часьцей Беларускай Вайсковай Акругі.

З адказным словам на прывітаньні рабочых і чырвонаармейскіх дэлегацый ад імя зьезду выступіў тав. Жуковіч.

У 10 гадз. 20 хв. т. Балцін пасяджэньне зьезду абвяшчае закрытым.

Раніцняе пасяджэньне 25 студзеня

На чацьвертым пасяджэньні зьезду працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Шаранговіча аб рабоце ЦК КП(б)Б.

— Прайдзены КП(б)Б ад XIII зьезду шлях па праве ўвойдзе ў гісторыю, як шлях буйнейшых перамог.

— Нашы посьпехі—гэта найбольш яркі, найбольш важкі довад правільнасьці той лініі, якую праводзіла КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт.

— Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і лепшага ленінца тав. Сталіна бальшавікі Беларусі пераможна вялі рабочую клясу па шляху завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

XIV зьезд, падагульваючы работу, мае права заявіць, што гэта задача з гонарам вырашана.

Вось адзін з найбольш значных вынікаў дзейнасьці нашай партыі. Такую ацэнку работы ЦК аднадушна даюць дэлегаты XIV зьезду КП(б)Б.

Асноўныя пытаньні, на якіх прамоўцы заастраюць увагу зьезду, — гэта ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, якасьць планаваньня, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, транспарт, кадры, павышэньне абароназдольнасьці краіны.

Гаворачы аб барацьбе з ухіламі ад лініі партыі, тав. Чапыжанка падкрэсьлівае наяўнасьць «очковтирательства». Гэтае зло, — гаворыць прамоўца, — за апошні час мае небывалае пашырэньне.

Работнікі паасобных прадпрыемстваў набылі прывычку з усякага повада рапартаваць. Скончана тая ці іншая пабудова ці не, ёсьць посьпехі ці няма іх — усё роўна людзі рапартуюць. Гэта робіцца ў такіх выпадках для таго, каб уцерці вочы. Аматар уціраць вочы — гэта горшага віду апартуніст. Па ім трэба біць з усёй сілай.

Т. т. Бутар, Аўсеенка, Качмар, Прыма, Гукала і інш. прыводзяць цэлы рад фактаў бюракратычнага, галавацяпскага планаваньня. Гэта галоўным чынам адносіцца да праводжаньня спэцыялізацыі — выкачаныя гаспадарчага кіраўніцтва раду раёнаў.

— Рагачоўскі раён, — гаворыць т. Аўсеенка, — жывёлагадоўча-бульбяны. Аднак, Насентрэст прысылае нам заданьні, як насенгаводчаму. У калгасах і саўгасах раёну налічваецца 18 тыс. буйной рагатай малочнай жывёлы. Саюзскур прыслаў плян загатовак скур (выключаючы дробную жывёлу) у колькасьці 17 тыс. штук. Гэта значыць, што пад нож трэба пусьціць амаль усё малочнае стада. Была таксама і Трактарацэнтр. У рагачоўскія майстэрні на рамонт вязуць трактары з Гомелю, а ў гомельскія — з рагачоўскіх саўгасаў. Таварышы сьцьвярджаюць, што ў іх няма штучнага ўгнаеньня, а ў нас, у Рагачове, запас гэтага ўгнаеньня на тры гады.

— Горацкі раён, — кажа т. Бутар, — ільняводча-малочны, але Наркамзем, які сам устанавіў напрамак гаспадаркі, дае заданьне на арганізацыю такой колькасьці сьвінаводчых гаспадарак, пры наяўнасьці якой раён ператвараецца ў жывёлагадоўчы. Ці можна злучыць сьвінаводства з ільном? На гэта пытаньне ні адзін спэцыяліст ня дасьць станоўчага адказу.

— Двайная барацьба з абязьлічкай, з ураўнілаўкай, укараненьне гаспадарчага разрахунку на радзе прадпрыемстваў ужо далі бліскучыя вынікі.

— Ліцейны цэх заводу «Камунар», — гаворыць тав. Паталаў, — выканаў прамфінплян за кастрычнік 1931 году на 123 проц., за лістапад — на 113 проц., і сьнежань — 111 проц. Брак зьніжан да 3 проц. у сьнежні, супроць 8,3 проц. у лістападзе.

— Я гэтыя лічбы, — кажа т. Паталаў, — падаю не дзеля таго, каб імі казырнуць. Гэтыя лічбы дэманструюць практычныя вынікі бальшавіцкай рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна. Яны (гэтыя лічбы) яшчэ і яшчэ раз гавораць, што гістарычныя сталінскія ўмовы зьяўляюцца ключом да перамог як у прамысловасьці, так і ў саўгасах і калгасах.

— Партыйныя канфэрэнцыі, якія праходзілі напярэдадні XIV зьезду, дэманстравалі маналітнасьць нашых радоў, бальшавіцкую згуртаванасьць КП(б)Б вакол ленінскага ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі т. Сталіна.

— Толькі дзякуючы гэтай згуртаванасьці, — гаворыць тав. Хлеўнікаў, — мы дабіліся буйнейшых, гістарычнага значэньня перамог.

Шпаркасьць тэмпаў разьвіцьця важнейшых галін народнай гаспадаркі БССР можна бачыць на прыкладзе росту прамысловасьці Гомелю, гэтага буйнейшага цэнтру нашай рэспублікі.

— Перад намі зараз паўстала з усёй вастрынёй задача пашырэньня энэргетычнай базы. Насьпела пытаньне аб пабудове ў Гомелі новай магутнай электрычнай станцыі.

З вялікай прамовай на зьезьдзе выступіў тракцыяр заходніх чыгунак тав. Падшывалін.

— На важнейшых вучастках нашай чыгункі за апошні час ёсьць відавочны зрух у бок павышэньня работы. У 1-м квартале зах. чыгунка дала 1.275 млн. тона-кілёмэтраў, у IV-м квартале — 2.100 млн. тона-кілёмэтраў. Па Гомельскім вузьле груза-паток складаў у першым квартале 143 млн. тона-кілёмэтраў, а ў IV-м квартале — 210 млн..

Гэта між іншым гаворыць аб росьце таварнасьці народнай гаспадаркі БССР.

— Дасягнутае,—кажа т. Падшывалін, — аднак, нас задаволіць не можа. Гэта відаць хаця-б з таго, што працант хворых паравозаў у нас дасягае 6 замест 2 па нормах. У 1931 г. мела месца 11.000 здарэньняў. У 1-м квартале было 15 выпадкаў крушэньня, а ў IV-м — 25.

Відавочна, што нам прадстаіць зрабіць ва многа раз больш таго, што ўжо дасягнута. Напружаньнем сіл і энэргіі партарганізацыі і рабочых мас чыгуначнага транспарту, мы абавязаны ў самы бліжэйшы час вывесьці транспарт з вузкага месца народнай гаспадаркі.

***

На гэтым пасяджэньні выступіла ў спрэчках 23 чалавекі. Сярод іх т. т. Шафран (Віцебск, фабрыка «Дзьвіна»), Камэнштэйн (ПСПСБ), Кудзелька (Мазыр), Кудзельскі (Заслаўе), Езлашоў (Полацак — вайсковы), Куляшоў і інш.

Пад канец пасяджэньня зьезд заслухаў прывітальныя тэлеграмы ад настаўніцкіх канфэрэнцый Ветні, Мсьціслаўля, Крычава, Мазыра, Клімавіч, Уваравіч і ад рабочых Віцебскай фабрыкі «Праф'інтэрн».

Вечарам працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Шаранговіча.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. КАГАНОВІЧА

на Маскоўскай абласной і гарадзкой партканфэрэнцыі

(Раніцняе пасяджэньне 24 студзеня)

На раніцнім пасяджэньні 24 студзеня закончыўся даклад тав. Кагановіча.

Тав. Кагановіч зрабіў падрабязную справаздачу па асноўных пытаньнях работы Маскоўскай партарганізацыі, як Маскоўская арганізацыя праводзіла генэральную лінію партыі, пастановы XVI зьезду і 6 умоў тав. Сталіна. У сваім дакладзе ён падрабязна спыняўся на паасобных заводах і будоўлях, на пытаньнях матар'яльнага становішча рабочых мас, заработнай платы, на пытаньнях грамадзкага харчаваньня, работы кааперацыі, разгортваньня савецкага гандлю, на пытаньнях культурнага росту рабочае клясы і г. д.

Спыніўшыся на пытаньнях міжнароднага становішча, тав. Кагановіч даў характарыстыку сучаснага сусьветнага крызісу капіталізму, яго асаблівасьцяй, абвастрэньня супярэчнасьцяй як паміж краінамі капіталізму, так і паміж краінамі капіталізму і краінай сацыялізму. На фоне міжнароднай і ўнутранай абстаноўкі тав. Кагановіч разгарнуў чарговыя задачы работы Маскоўскай партарганізацыі. Ён паказаў на канкрэтных прыкладах рад практычных задач у галіне прамысловасьці, выкарыстаньня натуральных багацьцяў Маскоўскай вобласьці, у галіне далейшага вызваленьня ад замежнай залежнасьці, спыненьня імпарту і г. д.

У галіне сельскай гаспадаркі тав. Кагановіч спыніўся на задачах уздыму ўраджайнасьці, разьвіцьця жывёлагадоўлі і ў іншых галінах, сыраварэньня, стварэньня кармавай базы, разьвіцьця агароднай справы і паляпшэньня якасьці гародніны.

Падрабязна спыніўся таксама на пытаньнях мэханізацыі сельскай гаспадаркі ў саўгасах і намеціў далейшыя задачы ў галіне калектывізацыі. Падкрэсьліўшы задачу завяршэньня калектывізацыі ў 1932-33 годзе, тав. Кагановіч адзначыў неабходнасьць змаганьня за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і іх таварнасьць, прывёў рад канкрэтных прыкладаў паасобных калгасаў, а таксама паасобных вясковых ячэек у справе барацьбы іх за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне.

Тав. Кагановіч спыніўся таксама на пытаньнях загатовак збожжа, ільну і гародніны.

Падрабязна тав. Кагановіч спыніўся на карэнных задачах гарадзкой гаспадаркі, у прыватнасьці на пытаньнях будаўніцтва ў Маскве мэтраполітэну, ён закрануў таксама праблему, спыніўшыся на Волга-Маскоўскім канале. Тав. Кагановіч спыніўся таксама на праблеме генэральнага пляну Масквы, на пытаньні аб надбудове паверхаў.

Далей тав. Кагановіч падкрэсьліў задачу разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, разьвіцьця самастойнай кааперацыі, у прыватнасьці, лепшай арганізацыі вырабу абутку і вопраткі для рабочых, зьніжэньня і ўдасканальваньня фатэрнатаў.

Тав. Кагановіч, пераходзячы да пытаньняў аб партыі, як зброі барацьбы, аб кіраўніцтве з боку МК, падкрэсьліў, як МК вучыўся кіраваць у ЦК, пад амаль штодзённым кіраўніцтвам якога ён працаваў. Паказаўшы на рост партячэек, пераходзячы да пытаньняў барацьбы за генэральную лінію партыі, тав. Кагановіч падрабязна асьвятліў, як змагалася Маскоўская арганізацыя за генэральную лінію, супроць розных скажэньняў яе.

Далей ён падкрэсьліў, што цяперашні пэрыяд патрабуе ад нас асабліва рашучай барацьбы з адхіленьнямі ад ленінскай лініі. На радзе канкрэтных ілюстрацый тав. Кагановіч падкрэсьліў, як шкодна падмяняць ідэйную барацьбу і выхаваньне, вывучэньне твораў Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна мэханічнымі мерамі выключэньня з партыі.

Спыніўшыся потым на сутнасьці дырэктыў ЦК аб другой пяцігодцы, іх велізарнейшым значэньні, тав. Кагановіч спыніўся на новых формах супраціўленьня клясавых ворагаў, якія ёсьць і будуць, падкрэсьліў неабходнасьць барацьбы з рознымі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі і асабліва з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай.

Тав. Кагановіч закончыў свой даклад заявай, што Маскоўская арганізацыя зараз згуртавана, як ніколі, вакол ЦК і яго кіраўніка, правадыра партыі тав. Сталіна (бурныя і працяглыя апладысмэнты).

Рэвалюцыйнаму Ваеннаму Савету СССР і яго кіраўніку—тав. Кліму Варашылаву

XIV зьезд КП(б)Б пасылае шчырае прывітаньне ад імя бальшавікоў Савецкай Беларусі Рэўваенсавету СССР і яго кіраўніку — тав. Кліму Варашылаву.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — непарыўная частка ўсяго Савецкага Саюзу, знаходзячыся на мяжы з капіталістычным Захадам, з асаблівай сілай адчувае рост шалёнай падрыхтоўкі сусьветнага капіталу да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз.

Падзеі ў Маньчжурыі яшчэ раз ярка падкрэсьліваюць падрыхтоўку імпэрыялізму для нападу на Савецкі Саюз.

Сусьветная буржуазія добра ведае, што Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік зьяўляецца магутнай апорай міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі.

Вось чаму з такой упартасьцю буржуазія ўсяго сьвету рыхтуе вайну супроць першай у сьвеце краіны Саветаў. Вось чаму мы павінны кожную хвіліну быць гатовымі да рашучага адпору ўзброенаму нападу на савецкія межы.

Яшчэ больш умацняючы абароназдольнасьць Савецкага Саюзу, яшчэ больш аказваючы дапамогу Чырвонай арміі, з яшчэ большай настойлівасьцю змагаючыся за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, мабілізуючы шырокія пралетарскія масы на выкананьне гістарычных задач бальшавіцкай пяцігодкі, мы з усёй рашучасьцю падкрэсьліваем, што «чужой зямлі мы не хочам, але і сваёй ні адной пядзі не аддамо» (Сталін).

Няхай жыве гераічная Чырвоная армія — непахісны вартавы межаў Савецкага Саюзу, няхай жыве Рэўваенсавет СССР і яго баявы кіраўнік—КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ!

Няхай жыве УсеКП(б) — арганізатар і праваднік сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

У барацьбе за сацыялізм куем баявую магутнасьць краіны Саветаў

БАЙЦЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, РАБОЧЫЯ І КАЛГАСЬНІКІ ВІТАЮЦЬ ЗЬЕЗД

Ад пагранчасьцей і войск ДПУ Беларусі

Прамова тав. Шостава

— Таварышы! Ад імя чырвонаармейцаў і начальніцкага складу пагранахоўы і ўнутраных войск АДПУ — XIV зьезду КП(б)Б баявое чэкісцкае прывітаньне.

XIV зьезд бальшавікоў Беларусі сабраўся ў той пэрыяд, калі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік падвёў вынікі гіганцкіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, падагуліў вынікі трэцяга рашаючага году пяцігодкі. СССР пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, уступіў у чацьвёрты, заключны год пяцігодкі, ідзе да новых посьпехаў, да новых перамог.

«Усе спробы імпэрыялістаў напасьць на СССР будуць намі адбіты».

У гэты час там, за рубяжом, у капіталістычных краінах, дзе пануе глыбокі эканамічны крызіс, буржуазія падрыхтоўвае новую вайну. Гэта падрыхтоўка ў першую чаргу накіравана супроць першай у сьвеце Савецкай рэспублікі.

Шукаючы выхаду з эканамічнага крызісу капіталізм узмацніў эксплёатацыю рабочай клясы. Праводзячы нашу работу па сацыялістычным будаўніцтве, мы ні на хвіліну не павінны забываць аб прыгнечаных пралетарах, аб лепшых барацьбітох за сацыялістычную рэвалюцыю.

Таварышы! Першая акруговая канфэрэнцыя партыйнай арганізацыі пагранахоўы і войск ДПУ падвяла вынікі тым дасягненьням, якія ёсьць у нашай рабоце па ахове межаў БССР, па чэкісцкай падрыхтоўцы, па рабоце сярод мясцовага насельніцтва пагранпаласы. Разам з гэтым першая акруговая партканфэрэнцыя выявіла рад недахопаў у нашай рабоце.

Да нашых посьпехаў мы адносім тое, што сацыялістычным спаборніцтвам увесь асабісты склад пагранахоўы ахоплен на 100 проц. Калгасамі ахоплена 81.9 проц. чырвонаармейцаў і начальніцкага складу з сялян.

Мы рашуча змагаемся за выніщэньне недахопаў, цьвёрда памятаем, што БССР знаходзіцца на рубяжы з белапанскай фашысцкай Польшчай. Мы гэта цьвёрда памятаем. Наша Чырвоная армія і яе авангард —пагранічнікі—пільна сочаць за ўсімі падзеямі, што адбываюцца за рубяжом.

Перад пагранахоўвай і ўнутранымі войскамі АДПУ пастаўлена баявая задача — аўладаць баявой тэхнікай. Як сымбаль узмоцненай нашай работы па аўладаньні тэхнікай, дазвольце перадаць зьезду ад імя пагранахоўы і ўнутраных войск АДПУ гэту танкетку (перадае ў прэзыдыум танкетку).

Няхай жыве XIV зьезд КП(б)Б!
Няхай жыве сацыялізм!
Няхай жыве Камінтэрн!

Ад №-скага палка

Прамова т. Крывашэіна

Няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, дае перамогу за перамогай на фронце індустрыялізацыі. Рост індустрыялізацыі, сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі стварылі моцную базу для ўкараненьня ў Чырвоную армію новай тэхнікі.

Наш полк знаходзіцца на фарпосьце Савецкага Саюзу, на мяжы з фашысцкай Польшчай. Гэта ўскладае на полк асабліва адказныя задачы ў справе баявой падрыхтоўкі. Памятаючы гэта, байцы, камандзіры і палітработнікі ўключыліся ў баявую эстафэту XIV гадавіны Чырвонай арміі па наступных асноўных пытаньнях: дабіцца высокаякаснай камандзірскай вучобы, выкананьня стральбы з адзнакай «добра», высокай вайсковай дысцыпліны і паглыбленьня марксыска-ленінскага выхаваньня.

У рэалізацыі ўсіх гэтых пунктаў полк дабіўся вялікіх посьпехаў. Ёсьць яшчэ, праўда, і асобныя недахопы, на ліквідацыю якіх зараз накіравана ўся ўвага чырвонаармейскага і камандна-палітычнага складу палка.

Полк вылучыў лепшых ударнікаў баявой падрыхтоўкі вітаць XIV зьезд бальшавікоў Беларусі і запэўніць, што задачы, якія пастаўлены перад палком па баявой і палітычнай падрыхтоўцы, будуць выкананы (воплескі).

Усе спробы інтэрвэнтаў напасьці на адзіную ў сьвеце краіну пралетарскай дыктатуры разаб'юцца аб сталь нашых баявых кашняў. Усе спробы перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву будуць разбураны нашымі сталёвымі вусеніцамі.

Няхай жыве XIV зьезд бальшавікоў Беларусі!

Няхай жыве камуністычная партыя — правадыр і арганізатар Чырвонай арміі!

Ад №-скай авіябрыгады імя СНК БССР

Прамова тав. Ліўшыца

Ад імя чырвоных лётчыкаў чырвонаармейскага і тэхнічнага складу №-й авіябрыгады імя СНК БССР бальшавіком Беларусі, дэлегатам XIV зьезду КП(б)Б — шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

— Таварышы! Чырвонаармейскі, лётчыцкі і тэхнічны склад нашай авіябрыгады прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве Савецкай Беларусі, пільна сочыць за падзеямі, якія адбываюцца за рубяжом. Кожны наш баец добра разумее абстаноўку міжнароднага становішча, тое, што сусьветны капіталізм выхаду з крызісу шукае ў падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу.

Наша авіябрыгада, пад кіраўніцтвам камандзірскага, палітычнага складу і сваёй партарганізацыі, дабілася значных посьпехаў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Няўхільнага нарастаючага ўзросту ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы — вось наш лёзунг.

Пры звальненьні байцоў 1907 году нарадзэньня ў доўгатэрміновы водпуск брыгада выпусьціла 93 трактарыстаў, 63 матарыстаў і 14 асоб камандзіравала ў навучальныя ўстановы. Па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» брыгада перавыканала кантрольныя лічбы на 25 проц. Усе гэтыя дасягненьні гавораць аб тым, што першы этап лётнай вучобы мы прайшлі з посьпехам. Па ацэнцы начальніка Э. П. С. акругі наша часьць стаіць на першым месцы.

Мы запэўняем XIV зьезд КП(б)Б, што заваяванага першага месца па баявой і палітычнай падрыхтоўцы мы не аддамо. Мы будзем праводзіць і паляпшаць сваю вучобу над лётнымі кадрамі процантнага выкананьня нашых планаў, будзем поўнасьцю ажыцьцяўляць пастаўленыя перад намі РВС задачы.

Дазвольце запэўніць зьезд ад імя лётчыцкага, чырвонаармейскага і тэхнічнага складу, што па першым закліку камуністычнай партыі наш паветраны флёт, які стаіць на рубяжы з белапанскай Польшчай, будзе ў першых радох барацьбітоў за Савецкую Беларусь, за Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Няхай жыве камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі!

Няхай жыве правадыр камуністычнай партыі—тав. Сталін.

Ад пяхотных часьцей БВА

Прамова тав. Ракашка

— Арганізатару і кіраўніку непераможнай Чырвонай арміі, арганізатару сацыялістычнага будаўніцтва ад байцоў, кам. і палітскладу пяхотных часьцей Беларускай Вайсковай Акругі — XIV зьезду камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі гарачае бальшавіцкае прывітаньне (воплескі).

Толькі дзякуючы выпрабаванаму кіраўніцтву ленінскай кампартыі і яе ЦК на чале з тав. Сталіным, у барацьбе на два фронты — з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, і «левымі» загібамі і прымірэнцтвам, партыя рабочае клясы дабілася выдатных перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, пабудова буйнейшых фабрык і заводаў, новыя сацыялістычныя гарады, трактарныя Сталінградскі, Асінбуд і г. д. — вось яны факты, якія пацьвярджаюць правільнасьць ленінскай генэральнай лініі партыі. Гэтыя факты — дынаміт, порах, якія ўзрывалі і будуць узрываць падпоры капіталістычнага ладу. Зараз здань камунізму ня толькі «блукае па Эўропе», зараз камунізм крышыць межы, падрывае падпоры і без таго разьдзёртага супярэчнасьцямі сусьветнага крызісу капіталізму.

Чыгуначнікі вітаюць зьезд

Пад кіраўніцтвам нашых брацкіх кампартый усё больш і больш хістаюцца падпоры капіталізму, узьнімаецца полымя сусьветнай рэвалюцыі. Пад кіраўніцтвам кампартыі ствараюцца непераможныя палкі Чырвонай арміі ў Кітаі, ствараецца новая Савецкая рэспубліка (воплескі).

Мы, малодшыя байцы, камандзіры і палітсклад, запэўняем XIV зьезд КП(б)Б, што будзем высока трымаць сьцяг Леніна, які прывядзе да новых перамог, да сусьветнай рэвалюцыі (воплескі). Мы запэўняем, што справа заваяваньняў Кастрычніка, справа абароны нашай савецкай краіны знаходзіцца ў верных руках (воплескі).

Пастановы XIV зьезду бальшавікоў Беларусі паслужаць для нас новым фактарам, які згуртуе яшчэ больш вакол генэральнай лініі партыі. Мы абяцаем упарта змагацца за рэалізацыю бальшавіцкіх пастаноў. Будзем заўсёды гатовы даць адпор паліяльнікам новай вайны. Няхай памятае капіталістычны сьвет, што новая вайна будзе пагібельна для сусьветнай буржуазіі.

Няхай жыве Чырвоная непераможная армія дыктатуры пралетарыяту!

Няхай жыве штаб сусьветнай рэвалюцыі — III Камінтэрн!

Няхай жыве XIV зьезд!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя! (Воплескі).

Прамова тав. Андрэя Александровіча на 2-й Менскай гарпартканфэрэнцыі

Таварышы!
І ў сьненне яшчэ ня было
(Мы—творцы гісторыі новай!)
Мільёнамі рук
    Жыцьцё ўзьняло
Сацыялістычную
    Пабудову.
Росквітам сонечным
    зьменены твар
Краіны загнанай, гарлівай.
Падмочан пэйзаж
    беларускіх карт
вясной
    бальшавіцкіх разьліваў.
За цэхам—цэх,
    За кварталам—квартал—
Колькі іх з гордасьцю ўзьнята
Гучных, як песьня,
    і дужых, як сталь—
У бацькаўшчыне
    пралетарыята.
Беларусь, і цябе
    ў пераклічцы гудкоў
Гісторыя толькі пачула.
Была ты старонкай
    хваёвых крыжоў
і ў балотах
мястэчак сутулых...
Сягоньня—
    сваім бальшавіцкім
        ростам
Гаварыцца
    сталіцы
        нястрымны поступ!
А быў парадок,
    і з далёкае даты
Сталіцаю звацца звык.
І ў сталіцы было:
    па-першае—губэрнатар,
    па-другое—капліца,
    па-трэцяе—гарадавы.
І была Серабранка, а там
сьвінабойня была і прытоны.
І была яшчэ там бедната,
ў сутарэньнях таіўшы стогны.
І было яшчэ—цэлы стан—
з палісаднікамі і кароўкай.
Гэта сан—
    беларускіх мяшчан
Ад Пярэсны і да Камароўкі.
Што ад Кальвары і да Кашараў
Праз Нізкі рынак
    і шынкі—
Алькагольным, як чад, перагарам
атручвалі горад тракціры.
І ня дзіва...
    Былі мы ускраінай
Імпэрыі рускай кароны.
І «сонзолини» вылучыць край яны
«чертой оседлости» й... пагромаў.
Вядома—
    «черту» да чорта!
Мы расхордылі ціну нацый.
Пралетарскай
    нязломнай кагортай
Выйшлі—
    жыць,
        будаваць,
            змагацца!
А змаганьне ў падпольлі было
І ў падпольлі
        расло!
    не ўстанавілася
І над краем
    былым, забалочаным,
дзе туманы
    сплываліся вужам,—
Мы славім сягоньня ў рабоч...
Гонар,
    геройства
        і мужнасьць!
Пустэчы дзе няўмерны абшар
Кілёмэтры бягуць рыштаваньняў.
Гэта партыі Леніна скарб,
І сьмяротныя ворагу здані.
А ворагаў нашых—рой
усіх колераў, смаку і паху—
перад вачыма
і за сьпінай,
то з правага, то з «левага» шляху.
Мы скрышылі адных
і скрышым
астатніх з ня нашага роду.
Наша сонца на нашае ўзвышша
Узьнімаецца з нашага ўсходу!
Усёй сілай сваёй агнявой
рушым, таварышы, у бой—
з песьняй фабрычных рот
Штурмаваць прыход
Пяцігодкі—
    апошні, чацьверты год!

У ДНІ ЗЬЕЗДУ ВЫКАНАЕМ СУСТРЭЧНЫ

БУДА-КАШАЛЕЎСКАЯ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

У ВЫНІКУ НЯЎХІЛЬНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, НА АСНОВЕ ШЫРОКАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ МАСАВА-АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ, САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ, У БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЕ З КУЛАЦТВАМ І ЯГО АГЕНТУРАЙ—ПРАВЫМІ І «ЛЕВЫМІ» АПАРТУНІСТАМІ, БУДА-КАШАЛЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК НА 100 ПРОЦ. У АДКАЗ НА АДОЗВУ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНУ, ВЫСОЎВАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗАГАТОВАК У КОЛЬКАСЬЦІ 100 ЦНТ., ЯКІЯ АБАВЯЗВАЕМСЯ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ Ў ДНІ РАБОТЫ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б.

ВЫКЛІКАЕМ ПАСЬЛЕДВАЦЬ НАШАМУ ПРЫКЛАДУ ЎСЕ СЕЛЬСАВЕТЫ І КАЛГАСЫ РАЁНУ. АДСТАЎШЫ ДУРАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ БЯРЭМ НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР.

СТАРШЫНЯ БУДА-КАШАЛЕЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ — НОВІКАЎ М.
САКРАТАР ПАРТЯЧЭЙКІ — НОВІКАЎ С.
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ «ГРОМ» — ЗАЙЦАЎ.
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» — ЛІСЕЙЧЫКАЎ.

РАПАРТ КАЛГАСАЎ ГЛУШЧЫНЫ

ГЛУСК. (ПА ТЭЛЕГРАФУ).

НАРАДА СТАРШЫНЬ КАЛГАСУ ГЛУСКАГА РАЁНУ РАПАРТУЕ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б АБ ПЕРАМОЗЕ НА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ. ГАДАВЫ ПЛЯН ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ ВЫКАНАН НА 138 ПРОЦ.

У АДКАЗ НА АДОЗВУ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ—БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНУ, ВЫСОЎВАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН У РАЗЬМЕРЫ 100 ТОН, І БЯРЭМ НА БУКСІР АДСТАЎШЫ АДНААСОБНЫ СЭКТАР.

НАРАДА СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ ГЛУШЧЫНЫ АБАВЯЗВАЕЦЦА ДА XVII УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

АД ІМЯ ПРЭЗЫДЫУМУ НАРАДЫ СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ ГЛУСКАГА РАЁНУ. ЮХНАВЕЦ.

Я. Ів.

Павялічэньне ў складзе партарганізацыі рабочых—важнейшая задача ўнутрыпартыйнага будаўніцтва

Вышэйшы орган КП(б)Б — XIV партзьезд — падагульвае пройдзены этап бальшавіцкага змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнага пляну сацыялістычнага будаўніцтва.

Пройдзены этап ад XIII да XIV зьезду КП(б)Б адзначаецца гіганцкімі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва, вялізарнейшымі эканамічнымі і сацыяльнымі зрухамі ў краіне, бурным ростам вытворчых сіл, пасьпяховым

завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

КП(б)Б, няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, у бязьлітаснай барацьбе на два фронты, у барацьбе супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левага» апартунізму і прымірэнцтва, атрымлівае перамогу за перамогай на ўсіх вучастках разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Дасягнутыя посьпехі ў галіне індустрыялізацыі, у галіне перабудовы вёскі на сацыялістычны лад і нацыянальна-культурнага будаўніцтва — наглядны паказальнік тэй вялізарнейшай работы, якую правяла КП(б)Б па мабілізацыі мас на штурм вышынь пяцігодкі пад баявым лёзунгам выкананьня яе за чатыры гады.

Гэта барацьба суправаджаецца магутным уздымам творчага энтузіязму і актыўнасьці рабочай клясы, бязьмежным давер'ем і самаадданасьцю яе свайму авангарду — партыі. Адным з важнейшых паказальнікаў творчага энтузіязму і актыўнасьці мас зьяўляецца ўзросшая цяга ў партыю, гатоўнасьць перадавых рабочых і калгасьнікаў з усёй энэргіяй змагацца на перадавых пазыцыях клясавых баёў за сацыялізм.

КП(б)Б з году ў год павялічвае свае рады за лік лепшай перадавой часткі рабочай клясы і найбольш перадавых калгасьнікаў, даказаўшых сваю клясавую ўстойлівасьць у барацьбе з кулаком. Склад КП(б)Б з часу з X да XIV партзьезду павялічыўся больш, як у два разы, пры ўзрастаючай удзельнай вазе рабочых і сыстэматычным зьніжэньні служачых (з 18.2 проц. да 9,1 проц.). Зараз па становішчы на 1 студзеня г. г. КП(б)Б налічвае ў сваіх радох 56.453 членаў і кандыдатаў партыі, з якіх рабочых па сацыяльным становішчы 65,1 проц. і рабочых, якія працуюць непасрэдна на вытворчасьці — 40,3 проц. (на 1-X—31 г. было 54.392).

Неабходны асабліва ўважлівы аналіз росту партарганізацыі за мінулы 1931 год, бо прыём за гэты год і поўны пэрыяд 1930 году дае некаторае зьніжэньне ўдзельнай вагі ў складзе арганізацыі процанту рабочых ад вар штату.

Склад прыёму характарызуецца наступнымі паказальнікамі:

Год	Агульны прыём	Рабочых	Калгасьнікаў	Служачых і інш.
1930	13.123	61,2 проц.	21 проц.	17,8 проц.
1931	13.289	57,4 »	27,6 »	15 »

Такім чынам, пры абсалютным павялічэньні рабочых на 3.156 чалавек у складзе прыёму за 1931 год у параўнаньні з прыёмам 1930 году мы маем зьніжэньне ўдзельнай вагі рабочых на 3,8 проц. і служачых на 2.8 проц. У складзе прыёму павялічылася колькасьць калгасьнікаў на 6,6 проц.

Важна адзначыць, як станоўчы фактар, павялічэньне прыёму ў партыю колькасьці старых кадраў рабочых. Сярод прынятых у партыю рабочых за час з 1 кастрычніка 1930 году да 1-га кастрычніка 1931 году рабочыя, якія працуюць на вытворчасьці з дарэвалюцыйнага часу, складаюць 26,4 проц. і рабочыя з 10-14-гадовым стажам — 38,8 проц. Сярод прынятых у партыю па катэгорыі служачых звыш 30 проц. — былыя рабочыя з вялікім вытворчым стажам, вылучаныя ў свой час з вытворчасьці, як перадавікі, у савецкія органы на кіруючую работу. Таксама сярод гэтай катэгорыі значная частка нашай пралетарскай інтэлігенцыі — інжынеры, тэхнікі і інш.

Зусім натуральным зьяўляецца павялічэньне росту мясцовых партарганізацый за лік калгасьнікаў. Гэты рост праходзіў у цеснай сувязі са штодзённай практычнай работай парт'ячэек па выкананьні гаспадарча-палітычных задач партыі на вёсцы, увязан з тымі посьпехамі, якія дасягнуты ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Аднак усе наяўныя станоўчыя фактары ў адносінах прыёму за мінулы год у партыю калгасьнікаў і служачых не выключаюць і не зьмяншаюць таго недахопу, які характарызуецца паніжэньнем удзельнай вагі ў складзе КП(б)Б колькасьці рабочых ад вар штату з 46.4 проц. у часе XIII партзьезду да 40,6 проц. на 1 студзеня 1932 году.

Зьніжэньне процанту рабочых тлумачыцца невыстарчальна суровым рэгуляваньнем сацыяльнага складу прыёму ў партыю з боку раду раённых партарганізацый, няпоўнасьцю фактаў недаацэнкі ўсёй важнасьці задачы **СЫСТЭМАТЫЧНАГА ПАВЫШЭНЬНЯ РОСТУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЗА ЛІК ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ**, неразуменьнем таго, што павышэньне пралетарскага асяродзішча ў партарганізацыі — важнейшая задача ўнутрыпартыйнага будаўніцтва.

У мэтах правільнага рэгуляваньня сацыяльнага складу партыйнай арганізацыі і ажыцьцяўленьня дырэктывы XII партзьезду аб даведзеньні ў складзе КП(б)Б ня меней 50 проц. рабочых, занятых непасрэдна на вытворчасьці, ЦК устанавіў для розных груп раённых партарганізацый нормы процант рабочых у складзе прыёму.

Ступень выкананьня дырэктывы ЦК мясцовымі партарганізацыямі за мінулы год відаць з наступнай табліцы:

Прынята рабочых за 1931 год.

Група раёнаў	Устаноўлены процант у прыёму рабочых	За І-шы квартал	За ІІ квартал	За ІІІ квартал	За IV квартал
I. Менск		95.1 проц.	66,1 проц.	74,3 проц.	80,5 проц.
Віцебск	95	90,6 »	91,0 »	55,5 »	96,9 »
Гомель		93,9 »	81,1 »	82,4 »	83,7 »
II. Іншыя гарадзкія раёны	80	82,5 »	68,5 »	79,7 »	
III. Раёны, у якіх ёсьць буйныя прадпрыемствы	60	54,6 »	45,5 »	39,3 »	
VI. Усе іншыя раёны	40	29,9 »	28,7 »	24,5 »	

Выкананьне дырэктывы партыі аб рэгуляваньні сацыяльнага складу прыёму ў партыю з посьпехам забясьпечыла Менская арганізацыя ў прыёме за першы квартал, віцебская—у IV квартале. Другая група гарадзкіх раёнаў перавыканала ўстаноўленую норму прыёму рабочых за першы квартал і амаль выканала гэту норму за трэці квартал. **Прыём у IV квартале па віцебскай, гомельскай і менскай партарганізацыях характарызуецца значным павышэньнем процанту рабочых.** Гэты посьпех неабходна ў далейшым разьвіваць, забясьпечваючы, поўнае выкананьне дырэктывы ЦК аб рэгуляваньні сацыяльнага складу.

Ад таго, наколькі будзе выконвацца ўстаноўлены процант рабочых у складзе прыёму па менскай, віцебскай і гомельскай партарганізацыях, у першую чаргу, як арганізацыях асноўных прамысловых цэнтраў, — вырашаецца задача павышэньня ўдзельнай вагі ў складзе КП(б)Б рабочых з вытворчасьці.

Надзвычай вялікае адхіленьне ад устаноўленага процанту прыёму рабочых дапускаюць раёны II і III груп. Ухіліць гэтых недахопаў можна толькі пры ўмовах, калі кожны райком, кожная парт'ячэйка будуць сыстэматычна падагульняць вынікі росту і рэгуляваньня сацыяльнага складу, калі гэта пытаньне будзе непарыўна звязана з усёй сыстэмай штодзённай работы мясцовых партарганізацый. На справе-ж прыходзіцца сустракацца з радам фактаў, калі некаторыя парт'ячэйкі і паасобныя райкомы вельмі невыстарчальна займаюцца пытаньнем росту, праяўляюць гэту важнейшую задачу лёгу самацёку, не заўсёды прытрымліваюцца бальшавіцкага прынцыпу строгага рэгуляваньня сацыяльнага складу.

На агульным фоне ўмацаваньня масавых парт'ячэек, іх колькаснага і ідэйнага росту, значнага палепшаньня работы па выкананьні чарговых задач партыі на вёсцы ёсьць выпадкі няправільнага падыходу да ажыцьцяўленьня задачы росту партыі. Няправільна тое, калі тая ці іншая парт'ячэйка робіць упор на пагоню за голымі лічбамі, за чыстай колькасьцю росту, таксама недапушчальны самацёк, бязьдзейнасьць у гэтай справе і выпадкі доўгага «марынаваньня» заяў аб прыёме ў партыю, што мае месца ў практыцы раду ячэек.

Работа па вярбоўцы ў партыю перадавых, правераных у баёх пралетараў і калгасьнікаў павінна быць сыстэматычнай, заснаванай на барацьбе за вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта работа павінна праходзіць у непарыўнай сувязі з ростам колькасных і якасных паказальнікаў работы таго ці іншага прадпрыемства, саўгасу, калгасу, дзе працуе ячэйка.

«Толькі такі рост сьведчыць аб тым, што новыя [illegible] дасягнуты ў баі, што іменна [illegible] за перамогу [illegible] якая ўцягнулася [illegible] мы дабіліся [illegible] ў нашы рады самых перадавых [illegible] рабочай клясы і калгасьнікаў [illegible] барацьбой [illegible] ў радах партыі... яшчэ больш магчымасьцяў для арганізаванага ўплыву на ход і тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва» (Пастанова).

Невычэрпальным рэзэрвуарам для росту партыі зьяўляецца камсамол, роля якога, як бліжэйшага памочніка партыі ў змаганьні за сацыялізм, незвычайна вялікая. Рады КП(б)Б папоўніліся за лік камсамольцаў толькі за 1930 год на 3.339 чал. і за першыя тры кварталы 1931 году на 2.749 чал. Зараз, калі ЛКСМБ ператвараецца ў шматтысячную арганізацыю, перад ім ва ўсёй шырыні стаіць задача выхаваньня камсамольскай моладзі ў духу ленінізму, у духу непрымірымай барацьбы з апартунізмам у тэорыі і на практыцы. Для гэтага неабходна ўзмацненьне кіраўніцтва работай камсамолу з боку партарганізацый, павышэньне адказнасьці за даручаную работу прымацаваных да работы ў камсамоле партыйцаў і пашырэньне парт'ядра ў камсамоле. Ад гэтага залежаць далейшыя посьпехі работы ўсіх зьвеньняў камсамольскай арганізацыі.

КП(б)Б праходзіць вялікі пераломны этап сацыялістычнага будаўніцтва, папоўніўшы свае рады за перыяд з XIII да XIV партзьезду дзесяткамі тысяч самаадданых перадавых пралетараў і калгасьнікаў. Наперадзе гіганцкія, даволі складаныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяховае вырашэньне якіх абумоўлена рэзультатамі ўсёй папярэдняй работы, ленінскай маналітнасьцю радоў нашай партыі, правільнасьцю генэральнай лініі, праверанай у баёх з клясавым ворагам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі.

Партыя ажыцьцяўляе перабудову масавай работы і арганізацыі ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і з новай абстаноўкай. Ад усіх зьвеньняў партарганізацый патрабуецца большая выразнасьць у рабоце, павышэньне пільнасьці да ўсякіх праяўленьняў апартунізму, да спроб трацкісцкай кантрабанды фальсыфікаваць ленінізм і бальшавіцкую гісторыю партыі, да гнілога лібэралізму. Гэтыя задачы настойліва вымагаюць самага шырокага разгортваньня марксыска-ленінскага выхаваньня партыйных мас, асабліва новага папаўненьня, сапраўднага ўзьняцьця тэарэтычнай вучобы на вышыню цяперашняга этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

ПРАМОВА тав. ГАЛАДЗЕДА НА II МЕНСКАЙ ГАРАДЗКОЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Таварышы, наша партыя перад XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыяй па ўсёй краіне падагульвае тыя вынікі, якія ёсьць на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Раённыя, гарадзкія, абласныя і рэспубліканскія канфэрэнцыі праводзяць пройдзены шлях, правяраюць выкананьне дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б), як гэтыя дырэктывы выкананы, што мы маем у галіне дасягненьняў на фронце будоўлі сацыялізму.

І менскія бальшавікі на сваёй другой партыйнай канфэрэнцыі таксама правяраюць сваю работу, работу ячэек і гаркому партыі. З таго дакладу, які зрабіў тав. Кавальчук, відаць, што менскім гарадзкім камітэтам партыі праробленa вялікая работа на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Менскія бальшавікі, на чале з гаркомам КП(б)Б, прыйшлі на другую гарадзкую партканфэрэнцыю са значнымі вынікамі практычнай працы на ўсіх галінах. Уся Менская арганізацыя прыйшла на канфэрэнцыю адзіна-згуртаванай вакол генэральнай лініі партыі і яе ЦК, ідэйна і палітычна ўзросшай і ўмацаванай.

Менскія бальшавікі паказалі шмат добрых прыкладаў бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне асноўнага лёзунгу нашай партыі — «пяцігодка за чатыры гады», і ў радзе важнейшых палітычна-гаспадарчых работ менская арганізацыя аказалася перадавой, вядучай арганізацыяй, якая дае прыклад другім арганізацыям КП(б)Б. Зьяўляючыся надзейнай і моцнай апорай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б менская арганізацыя і надалей будзе ісьці ад перамогі да перамогі.

Адначасова трэба адзначыць, што ёсьць яшчэ і рад недахопаў у рабоце менскай арганізацыі. Гэтыя недахопы вы абгаварвалі, трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю, шляхам шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі выкрываць гэтыя недахопы для таго, каб іх у далейшым не паўтараць. Рашучае выкрыцьцё недахопаў дапаможа нам лепш мабілізавацца на выкананьне пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі і ўнікнуць тых прабелаў і прарываў, якія меліся ў нашай рабоце побач з вялікімі дасягненьнямі. Гэтымі словамі я абмяжуюся ў характарыстыцы работы менскага гаркому.

Зараз я хачу спыніцца на некаторых першачарговых задачах работы менскай партыйнай арганізацыі на бліжэйшы час. Я закрану толькі 3-4 на мой погляд важнейшых і рашаючых пытаньняў. Гэта значыць: 1) на пытаньні аб тым, што мы павінны рабіць далей па лініі палепшаньня работы прамысловасьці і яе далейшага разьвіцьця. 2) што павінны рабіць у галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі, 3) якія практычныя меры вызначыць у галіне паляпшэньня матар'яльнага і бытавога становішча рабочай клясы і 4) што павінна зрабіць менская арганізацыя для таго, каб узьняць свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень яшчэ на больш высокую ступень. На мой погляд гэта галоўнейшыя і вядучыя чатыры задачы на будучы час. Імі павінен кіравацца ў сваёй рабоце новы менскі гарком, які будзе вамі выбраны, і павінна кіравацца ўся менская партыйная канфэрэнцыя.

ЗАДАЧЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Якія-ж канкрэтныя задачы павінны мы перад сабой паставіць у галіне паляпшэньня працы прамысловасьці і яе разьвіцьця.

Перш за ўсё мы павінны ад імя канфэрэнцыі заклікаць усю рабочую клясу гор. Менску для таго, каб прамфінпляны, якія намі складзены на чацьверты, заключны год пяцігодкі, былі-бы выкананы на ўсе 100 проц. і перавыкананы.

Другая менская партканфэрэнцыя праводзіць сваю работу ў пачатку новага гаспадарчага году. Таму нам трэба ад імя гарадзкой канфэрэнцыі заявіць рабочым гор. Менску, што бальшавікі патрабуюць абавязковага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Якія-ж мэтады мы павінны ўжыць для таго, каб забясьпечыць на справе яго выкананьне? Выкананьне прамфінпляну магчыма пры адной абавязковай умове — калі мы на кожным прадпрыемстве, у кожнай парт'ячэйцы, фабкоме, у кожнай гаспадарчай арганізацыі не на словах, а на справе на ўсе 100 проц. ажыцьцёвім 6 гістарычных умоў тав. Сталіна. Гэта галоўная і рашаючая ўмова для поўнага выкананьня прамфінпляну. Трэба не забываць таго, што прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, у якой ён указаў на 6 бальшавіцкіх умоў — гэта ёсьць важнейшы гістарычны дакумант нашага часу, які мабілізуе ўсю бальшавіцкую партыю і рабочую клясу для прасоўваньня наперад па шляху сацыялізму. Гэта галоўнае і вядучае ўказаньне, якое забясьпечвае нам далейшае прасоўваньне наперад, на вышэйшую ступень усёй пралетарскай рэвалюцыі.

Зразумець і ажыцьцявіць 6 умоў тав. Сталіна — гэта значыць аўладаць асноўнымі вагарамі для забесьпячэньня далейшага ходу будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

У гэтых 6 умовах тав. Сталін накіроўвае нас: 1) правільна арганізаваць набор і вярбоўку рабочай сілы.

2) Лепш арганізаваць працу на вытворчасьці, што азначае наогул лепшую арганізацыю сацыялістычнай вытворчасьці і павышэньне прадукцыйнасьці працы.

І арганізаваная вярбоўка рабочай сілы, і лепшае яе выкарыстаньне і скарыстаньне на прадпрыемстве — гэта шчыльна адно з другім зьвязана.

Ці працуем мы над выкананьнем гэтых двух умоў на прадпрыемствах гор. Менску? Так, працуем, але зусім недастаткова, мала працуем. Часта мы пішам рэзалюцыі аб выкананьні 6 умоў тав. Сталіна, але часта забываем аб тым, што напісалі ў сваіх рэзалюцыях. На справе-ж нам патрэбны ня прыгожыя рэзалюцыі, а бальшавіцкае практычнае выкананьне гэтых 6 умоў.

Трэцяя ўмова — гэта лепш арганізаваць тэхніку вытворчасьці, лепш скарыстаць тэхнічныя кадры, якія ў нас ёсьць. Арганізоўваючы падрыхтоўку новай пралетарскай тэхнічнай інтэлігенцыі, выходзячы з таго, што гэта галоўная наша задача, адначасова мы павінны скарыстаць і тых старых спэцыялістаў, якія прыйшлі добрасумленна працаваць на вытворчасьці і працуюць па дырэктывах савецкай улады. Мы павінны стварыць для іх працы належныя ўмовы.

Ці робім мы гэта на справе, ці не? Па-мойму, не заўсёды. І тут гаворым больш, чым робім. І гэта мае вялізарнейшае значэньне.

Наша народная гаспадарка, прамысловасьць у асаблівасьці, зараз ужо ўзьнята на такую ступень калі далейшае пасьпяховае яе разьвіцьцё амаль што цалкам упіраецца ў неабходнасьць карэннай тэхнічнай рэканструкцыі на базе высокай тэхнікі. Таму нам неабходна скарыстаць усе веды тэхнічна-падрыхтаваных спэцыялістаў, якія працуюць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва.

Для таго, каб ажыцьцявіць лёзунг «дагнаць і перагнаць капіталістычныя дзяржавы ў тэхнічна-эканамічных адносінах» нам абавязкова трэба павысіць тэхнічны ўзровень нашай сацыялістычнай прамысловасьці і для гэтага трэба скарыстаць людзей, якія маюць веды, бо бяз гэтага мы ня зможам у патрэбныя нам тэрміны — у бліжэйшыя 5-10 год, як гаварыў тав. Сталін выканаць лёзунг аб тым, каб перагнаць капіталістычныя краіны.

Такім чынам, выконваючы па-бальшавіцку галоўную задачу ў справе падрыхтоўкі тэхнічных кадраў — гэта значыць у падрыхтоўцы сваёй пралетарскай тэхнічнай інтэлігенцыі адначасова неабходна ў максымальнай меры скарыстаць інтэлігенцыю і старой школы, стварыўшы найбольш спрыяючыя ўмовы для яе работы.

Чацьвертая ўмова тав. Сталіна нас вучыць — палепшыць снабжэньне рабочых. І тут мы многа гаворым, але не заўсёды добра робім. Аб гэтай задачы я буду гаварыць далей спэцыяльна.

Далей, пятая ўмова — аб ліквідацыі абязьлічкі. Ці праведзена ў нас на прадпрыемствах поўнае выкараненьне абязьлічкі? Па-мойму, яшчэ не праведзена. Ліквідаваць абязьлічку — гэта азначае: прымацаваць інструмант, машыну, варштат і г. д. да свайго гаспадара, маючы на ўвазе, што гэта галоўнейшая задача. Нам трэба дабіцца таго, каб кожны варштат, усякі інструмант, машыны мелі-б свайго настаяннага гаспадара —рабочага, які-б клапаціўся аб яе спраўнасьці, трымаў яе ў парадку, адносіўся-б да яе як да дзяржаўнай маемасьці для таго, каб гэтая машына, або варштат давалі-б нам больш карысьці.

Далей, шостая ўмова аб гаспадарчым разрахунку. Гэта адна з важнейшых 6 умоў т. Сталіна. Устанавіць сапраўдны гаспадарчы разрахунак на прадпрыемстве — гэта адна з важнейшых гаспадарчых задач, якая дапамагае нам па-гаспадарску арганізаваць вытворчасьць, клапаціцца аб выкананьні прамфінпляну і берагчы народную капейку.

Як праводзіцца гаспадарчы разрахунак? Ня ўсюды добра. Многія гаспадарнікі на праводзеньне гаспадарчага разрахунку глядзяць яшчэ зусім несур'ёзна.

Асаблівае значэньне ў выкананьні прамфінпляну 1932 году мае выкананьне якасных паказальнікаў. Мы многа гаворым аб паляпшэньні якасьці прадукцыі, і тав. Кавальчук у сваім дакладзе падаў жывы прыклад славутай шапкі, якая нам напамінае аб тым, што ў нас ёсьць ня толькі на прадпрыемствах, якія вырабляюць сродкі спажываньня, але і сродкі вытворчасьці, цэлы рад прарываў у якасьці прадукцыі. Колькі гэта каштуе пралетарскай дзяржаве? Гэта каштуе вельмі дорага. Напрыклад, ад дрэннай якасьці прадукцыі спажываньня, якую выпрацоўвае тое ці іншае прадпрыемства, церпіць рэальная зарплата рабочых — яго бюджэт. А калі выпускаюцца сродкі вытворчасьці дрэннай якасьці — то ад гэтага церпіць ужо ўся індустрыялізацыя СССР. Калі, напрыклад, на тым ці іншым прадпрыемстве выпусьцяць дрэнны варштат, ці дрэнную машыну, то ад гэтага ўжо церпіць уся індустрыялізацыя. Такім чынам, якасьць прадукцыі і наогул выкананьне ўсіх якасных паказальнікаў— гэта цэнтральнае зьвяно ў рабоце па выкананьні прамфінпляну 1932 г.

Многія ведаюць, што амаль на кожным прадпрыемстве робяць даклады пра аўладаньне тэхнікай, але, на жаль, у радзе выпадкаў толькі абмяжоўваюцца дакладамі, а колькі ёсьць жывых прыкладаў па сапраўдным аўладаньні тэхнікай, укараненьні яе ў вытворчасьць, а таксама сярод шырокіх рабочых мас. Такія прыклады ёсьць, але іх зусім ня многа. Трэба па-сапраўднаму біцца за ўкараненьне тэхнікі. У 1932 годзе нам неабходна скарыстаць вопыт перадавых прадпрыемстваў Масквы, каб у нас быў ня толькі прамфінплян, а прамфінтэхплян і за яго ажыцьцяўленьне біцца ўсімі сіламі і сродкамі. Трэба дабіцца такога становішча, каб прамфінплян 1932 г. па радзе прадпрыемстваў складаўся-б з трох важнейшых яго элемэнтаў. Гэта значыць — колькасьць і якасьць выпусканай прадукцыі, фінансы і тэхніка. Вось з гэтых трох важнейшых элемэнтаў павінен складацца прамфінтэхплян.

Мы абавязкова павінны шырокім фронтам на ўсіх прадпрыемствах гор. Менску перайсьці на прамфінтэхплян з пачатку 1932 г. і па-бальшавіцку біцца за яго выкананьне. Гэта і будзе азначаць на справе, што мы па-бальшавіцку будзем ажыцьцяўляць 6 гістарычных умоў тав. Сталіна і біцца за тэхніку, за яе ўкараненьне ў вытворчасьць і за аўладаньне тэхнікай. Калі мы дабёмся таго, што аўладаньне тэхнікай будзе складаць адну з важнейшых састаўных частак усяго прамфінпляну, дык гэта і будзе тое, што нам патрэбна, і тады мы лепш, чым у рэзалюцыі, на справе аўладаем тэхнікай.

Вось прыкладна тыя пытаньні, якія маюць рашаючае значэньне ў паляпшэньні працы прамысловасьці і яе далейшага разьвіцьця. Значыцца мы ўмаўляемся на тым, што ў 1932 г. прамфінплян па прадпрыемствах гор. Менску будзе ня толькі на 100 проц. выкананы, але і перавыкананы.

Цяпер аб задачах у разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ — ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

У разьвіцьці сельскай гаспадаркі ў 1932 г. галоўнай і генэральнай задачай зьяўляецца задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Гэта вядучая і рашаючая задача ў разьвіцьці ўсёй сельскай гаспадаркі і ў далейшым яе сацыялістычным пераўтварэньні. Прычым, трэба выходзіць з таго, што мала гаварыць аб тым, што арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца галоўнай задачай, а трэба на справе гэта ажыцьцявіць, дзеля чаго мы павінны вызначыць канкрэтную практычную праграму для кожнага калгасу сапраўднага арганізацыйна-гаспадарчага яго ўмацаваньня.

Неабходна прадугледзець у гэтай праграме ўсе практычныя пытаньні працы калгасу, якія складаюць асноўныя элемэнты арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня і па-бальшавіцку правесьці гэту практычную праграму.

На падставе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў мы павінны адначасова па-бальшавіцку ажыцьцяўляць задачу далейшай калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак БССР.

Пастановай ЦК КП(б)Б вызначан ахоп калгасамі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак у сярэднім па БССР у размеры 65 проц. да канца 1932 г. Каб гэта ажыцьцявіць на справе абавязкова неабходна па-бальшавіцку кіраваць гэтай задачай, бо калі мы не наладзім сапраўднага кіраўніцтва і ня будзем кіраваць далейшым калгасным рухам, дык мы можам мець такія выпадкі, калі ў некаторых мясцох могуць дапусьціць непатрэбныя «лявацкія» перагібы, што мела месца ў радзе выпадкаў у мінулым годзе, або наадварот, — у некаторых мясцох могуць дапускаць непатрэбныя самацёчныя адносіны да гэтай важнейшай задачы.

Праз арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, праз лепшую арганізацыю іх працы, праз лепшую пастаноўку калгаснай вытворчасьці мы павінны працаваць над тым, каб завяршыць у асноўным калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР у вызначаны ЦК УсеКП(б) тэрмін — у 1932-1933 годзе.

Важнейшай вытворчай задачай у сельскай гаспадарцы на 1932 г. зьяўляецца задача паляпшэньня якасьці працы калгасаў і саўгасаў. Якасьць працы саўгасаў і калгасаў, барацьба за пастаноўку вытворчых задач сельскай гаспадаркі на вышэйшую ступень — гэта зьяўляецца асноўным лёзунгам на 1932 г. у разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

Асноўнай праблемай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі БССР, як ужо ўсім вядома, зьяўляецца праблема разьвіцьця жывёлагадоўлі. Мы над гэтай задачай шмат працавалі, уклалі многа сродкаў, а вынік гэтай працы нельга прызнаць здавальняючым, і толькі таму, што якасьць працы паасобных працаўнікоў у саўгасах і калгасных таварных фэрмах нікуды ня варта. Значыцца, зараз пытаньне складаецца ня толькі з таго, каб забясьпечыць работу саўгасаў і калгасаў неабходнымі фінансавымі сродкамі і сродкамі вытворчасьці. Тут мы ўжо дабіліся ня малых вынікаў, а галоўная задача заключаецца ў тым, каб і ў сельскай гаспадарцы выконваць якасныя паказальнікі, у 10 раз палепшыць якасьць працы.

А якая ў нас якасьць працы па разьвіцьці жывёлагадоўлі? Я павінен на канфэрэнцыі заявіць, што яна вельмі дрэнная.

З матар'ялаў, якія дастаўлены нам РСІ пасьля абсьледваньня становішча некаторых жывёлагадоўчых саўгасаў, відаць, што шмат укладзеных сродкаў і сіл у разьвіцьцё жывёлагадоўлі не даюць належнага эфэкту толькі таму, што дрэнна працуем. Значыцца, мы многа трацім сіл і сродкаў на вырашэньне гэтай важнейшай праблемы, якая пастаўлена перад усёй партыяй — разьвіцьцё жывёлагадоўлі, але дзякуючы няздольнасьці некаторых працаўнікоў, нежаданьню іх па-новаму, па-бальшавіцку працаваць, часта гэтыя ўкладаньні не даюць нам належнага эфэкту. Напрыклад, па саўгасах Сьвінавод на тэрыторыі БССР з 150.000 галоў сьвіней дзяржаве здана толькі некалькі тысяч. Некаторы процант перадалі калгасам і іншым саўгасам на аднаўленьне стад, тысячы дзьве з паловай здана ў саўгасы.

Мы маем даволі вялікі процант адыходу маладняка, а ў асобных саўгасах ён даходзіць да 40%. Чаму так атрымліваецца? Адказ тут адзін—таму што мы ня ўмеем гаспадарыць, як сьлед, таму, што мы ня ўмеем добраякасна працаваць, таму, што ў нас ёсьць яшчэ шмат такіх кіраўнікоў саўгасаў, якія кіруюць «наогул», не канкрэтна, ня цікавяцца канкрэтнай справай, не даглядаюць па-гаспадарску за даручанай справай, не вывучаюць па сутнасьці ўсіх дэталяў даручанай ім справы.

Аб чым гэта нам гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што мы павінны мабілізаваць увагу ўсіх камуністаў, усіх бальшавікоў Беларусі, у першую чаргу Менскай арганізацыі, на барацьбу за якасьць працы ў саўгасах і калгасах. Сродкаў у нас хапае, капіталаўкладаньні зрабілі мы вялікія, матар'яльная база ўжо досыць добрая, умовы для разьвіцьця сьвінагадоўлі таксама добрыя. Яны складаюцца з таго, што мы арганізавалі савецкія і калектыўныя гаспадаркі, але як мы скарыстоўваем гэтыя сродкі, які эфэкт ад іх атрымліваем? Гэта цалкам залежыць ад якасьці нашай працы. Але—гэта якасьць працы—самая галоўная і асноўная задача. У гэтым разе пытаньня. Ад гэтага залежыць сапраўднае бальшавіцкае выкананьне намечаных плянаў па разьвіцьці жывёлагадоўлі і ня толькі жывёлагадоўлі, і ўсіх вытворчых задач у сельскай гаспадарцы, у першую чаргу ў саўгасах і калгасах.

Якія сродкі ёсьць у нас для паляпшэньня якасьці працы пры выкананьні вытворчых задач у сельскай гаспадарцы? Асноўным і рашаючым сродкам зьяўляецца абавязковае 100-процантнае ўкараненьне 6 умоў тав. Сталіна ў працу саўгасаў і калгасаў. Умовы тав. Сталіна могуць быць на ўсе 100 проц. дастасаваны ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Толькі барацьба за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне гэтых 6 умоў тав. Сталіна гарантуе нам выкананьне пляну 1932 г. па разьвіцьці сельскай гаспадаркі.

Вось гэта другая важнейшая задача, якая павінна стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй Менскай арганізацыі.

Такім чынам, упор на паляпшэньне якасьці працы прамысловасьці і далейшага разьвіцьця, барацьбу за прамфінтэхплян, за 100 проц. яго выкананьне, барацьбу за абавязковае выкананьне якасных паказальнікаў, барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за паляпшэньне якасьці працы ў саўгасах і калгасах, за вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі, шляхам ужываньня бальшавіцкіх метадаў працы, за ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы—гэта ёсьць галоўнейшыя і важнейшыя задачы ў рабоце Менскай арганізацыі на 1932 г.

Галоўны ўпор мы павінны зрабіць на гаспадарчую работу, змаганьне за гаспадарку. Гэта азначае на справе будаваць сацыялізм. Гэта азначае на справе весьці барацьбу за ліквідацыю рэштак капіталізму і за арганізацыю бяскласавага грамадзтва. Так стаіць справа з першымі дзьвюма задачамі, якія я хацеў высунуць перад Менскай партыйнай арганізацыяй.

НЯУХІЛЬНА ПРАЦЯГВАЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

Цяпер дазвольце спыніцца на трэцяй важнейшай задачы, якая павінна стаяць у галаве работы ўсёй Менскай партыйнай арганізацыі — гэта на паляпшэньні снабжэньня ўсёй рабочай клясы і на паляпшэньні яе бытавога абслугоўваньня.

Як было гэта сказана раней, — адной з асноўных 6 умоў тав. Сталіна зьяўляецца ўмова абавязковага паляпшэньня забесьпячэньня рабочай клясы. Ён там сказаў, што рабочая кляса хоча лепш і культурней жыць, і таму па справядлівасьці прад'яўляе нам большыя запатрабаваньні са свайго боку, і гэта зусім справядліва. Чаму? Ды таму, што пралетарыят, тварыўшы Кастрычніцкую рэвалюцыю, устанавіўшы пралетарскую дыктатуру за 14 з паловай год свайго панаваньня, змог на справе давесьці сваю здольнасьць і арганізаваць па-сапраўднаму сацыялістычную вытворчасьць. Выконваючы заветы Леніна і дырэктывы бальшавіцкай партыі, рабочая кляса за гэты час прасунула справу сацыялістычнай рэвалюцыі далёка наперад, узьняўшы арганізацыю сацыялістычнай вытворчасьці на высокую ступень.

Рабочая кляса праявіла шырокую ініцыятыву, творчую энэргію, выявіўся цэлы рад новых сацыялістычных мэтадаў працы, выявілася здольнасьць і ўменьне працаваць і арганізоўваць вытворчасьць па-новаму, па-сацыялістычнаму. Таму справядлівымі зьяўляюцца запатрабаваньні з боку рабочай клясы на паляпшэньне свайго матар'яльнага і культурнага становішча.

Так, прыкладна, пастаўлена пытаньне тав. Сталіным у сваіх 6 умовах.

У чым-жа заключаецца наша практычная задача? Яна заключаецца ў тым, каб мы на справе маглі ажыцьцявіць указаньне тав. Сталіна аб паляпшэньні матар'яльнага забесьпячэньня і камунальна - жыльлёвага абслугоўваньня рабочых мас. Гэта адна з асноўных задач, пры выкананьні якой мы можам ня толькі выканаць, але і перавыканаць плян чацьвертага, заключнага году пяцігодкі і з новай сілай і ініцыятывай уступіць у новую пяцігодку і будзем яшчэ мацней біцца за больш высокія тэмпы індустрыялізацыі і ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва.

Як практычна ажыцьцявіць задачу паляпшэньня снабжэньня рабочай клясы?

Мне думаецца, што, у першую чаргу, мы павінны ўзяцца за сапраўднае наладжваньне працы рабочай кааперацыі і наогул усёй сыстэмы савецкага гандлю. Нам на справе патрэбна зрабіць ЗРК і ЦРК важнейшымі цэхамі прадпрыемства. Снабжэньне рабочай клясы і выразная работа снабжаючых органаў—гэта ёсьць неадрыўнае і адно з галоўных звеньняў, галоўны цэх любога прадпрыемства.

Дабіцца выразнасьці ў рабоце нашых снабжаючых органаў — органаў Наркамснабу і ўсёй кааперацыйнай сыстэмы, арганізацыя шырокай ініцыятывы ў рабоце ЗРК і ЦРК, арганізацыя і добрая пастаноўка грамадзкага харчаваньня — гэта важнейшыя складаныя элемэнты працы ў выкананьні пяцігодкі ва чатыры гады.

Работа ўсёй тавараправодзячай сеткі, галоўным чынам, кааперацыі, пачынаючы ад ЗРК і аж да ВКС і Цэнтрасаюзу, — гэта цяпер важнейшыя ўчасткі работы нашай партыі, бо гэта важнейшыя вагары ў руках пралетарскай дзяржавы, якімі мы карыстаемся пры арганізацыі снабжэньня рабочай клясы. Таму неабходна зварачаць максымальную ўвагу на работу спажывецкай кааперацыі, а таксама на наладжваньне шырокага грамадзкага кантролю над яе дзейнасьцю.

Вы павінны паставіць на работу ў ЗРК лепшых людзей, перадавых ініцыятыўных пралетараў, выходзячы з таго, што гэты ўчастак работы адыгрывае важнейшую ролю ў выкананьні народна-гаспадарчага пляну.

А як у нас справа стаіць з работай спажывецкай кааперацыі і снабжаючых органаў? Нельга сказаць, што яна стаіць добра. У гэтай галіне яшчэ ёсьць вельмі шмат недахопаў.

Мы складаем, зьвярстваем пляны забесьпячэньня, выносім пастановы аб іх, а як праводзяцца гэтыя пляны харчовага і таварнага снабжэньня ў жыцьцё — аб гэтым многія з нас ня ведаюць, бо частка нашых працаўнікоў на сваю работу па снабжэньні глядзяць так, што вось склалі пляны і на гэтым справе канец, а глыбей у справу не ўваходзяць. І ў такіх выпадках бывае, што кладаўшчык або рахункавод якога-небудзь складу ЦРК ці іншая інстанцыя кааперацыі выпісвае накладную па-свойму і ўсю нашу палітыку ставіць уверх тармашкамі.

Маем-жа мы такія выпадкі, калі, скажам, пад відам галянтарэі ўсе бюстгальтары са складу кааперацыі накіравалі для снабжэньня лесарубаў на лесазагатоўкі. Як бачыце, кладаўшчык надумаў, што бяз іх лесаруб ня можа працаваць (сьмех). А ў другім месцы мы мелі такі факт, што для лесазагатовак накіравалі вялікую партыю ажурных панчох (сьмех).

Трэці выпадак. Наша партыя і савецкая ўлада вызначае адпаведныя фонды прамтавараў для прэміяваньня лепшых ударнікаў вытворчасьці. І вось у Гомель адаслалі для прэміяваньня ўдарнікаў эмаліраванае начыньне (так значылася на накладной). А калі пачалі разьбіраць гэта начыньне, дык выявілася, што там начныя гаршкі (сьмех), праўда, таксама эмаліраваныя. А нашы кіраўнікі, якія далі загад накіраваць неабходныя тавары для прэміяваньня ўдарнікаў, лічылі, што яны зрабілі добра, бо з накладной відаць, што тавар пасланы, а на справе аказалася, што гэта зьдзек з ударнікаў.

Чаму гэта так атрымліваецца? Чаму так безгаспадарна разьмяркоўваецца тая ці іншая прадукцыя? Таму, што пытаньню фактычнай рэалізацыі нашых пастаноў не надаецца належнай увагі ні самімі кіраўнікамі-камуністамі, якія павінны выконваць пастановы партыі і ўраду, ні іх памочнікамі, а давяраюць гэту справу тэхнічным працаўнікам—рахункаводам і кладаўшчыкам, лічачы, што яна тэхнічная. А што за накладной робіцца, аб гэтым многія і ня ведаюць.

Такім чынам, часта нашы пастановы перакручваюцца ўверх дном звычайным тэхнічным працаўніком, які або нядобрасумленна працуе, або сьвядома нас ашуквае, або ня хоча працаваць. А нашы камуністы-кіраўнікі часта штампуюць іх накладныя.

Такі прыклад быў і в прэміяваньні ударнікаў заводаў «Бальшавік» і імя Варашылава ў Менску.

Разьмяркоўвалі паміж гэтымі двума прадпрыемствамі прамтавары не па колькасьці ўдарнікаў на гэтых заводах, а па агульнай колькасьці рабочых. І атрымалася так, што на адным прадпрыемстве больш рабочых, але менш ударнікаў, то значыць гэтыя ўдарнікі атрымалі большую прэмію. Выходзіць так, што большае заахвочваньне атрымалі ўдарнікі тых прадпрыемстваў, дзе рабочыя менш ахоплены мэтадамі ўдарнай працы.

Чаму на такую справу — фактычнага разьмеркаваньня прамтавараў па асартыменце і па якасьці — не пасадзіць лепшых камуністаў, лепшых кіраўнікоў? Чаму партыйная ячэйка слаба займаецца гэтай справай? Чаму кіраўнікі снабжаючых органаў ня ўвойдуць, як сьлед, у тэхніку сваёй працы?

Справа снабжэньня рабочай клясы вельмі сур'ёзная. Гэта задача ў 1932 г. стаіць перад намі, як адна з галоўнейшых задач.

Вось трэцяе пытаньне, якое я высоўваю перад менскай партарганізацыяй у якасьці баявой задачы для работы ў 1932 г.

ЗА КАНКРЭТНАЕ КІРАЎНІЦТВА

У сувязі з гэтымі трыма вышэйпералічанымі задачамі (работа прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і снабжэньне рабочых) я хачу паставіць яшчэ адно пытаньне — аб наладжваньні канкрэтнага кіраўніцтва з боку савецкіх, гаспадарчых і партыйных арганізацый.

Асноўным недахопам у нашай рабоце зьяўляецца тое, што мы да гэтага часу часамі кіруем «наогул», а гэта значыць часта сьлізгаем па паверхні, мала канкрэтызуем наша кіраўніцтва. Гэты недахоп у рабоце ряду кіруючых органаў трэба прызнаць з усёй бальшавіцкай рашучасьцю. Гэта датычыць і цэнтральных беларускіх, і менскіх гарадзкіх арганізацый.

Многія нашы гаспадарчыя і савецкія арганізацыі абмяжоўваюцца агульнымі пастановамі па тым ці іншым пытаньні і думаюць — раз пастанову вынесьлі, то ўсё будзе ў парадку, або абмяжоўваюцца цыркулярамі, ці агульнымі дакладамі, якія нічога не гавораць. І гэта сухая літара, непатрэбная пісаніна зацямняе жывую справу.

На справе гэта азначае —людзі адрачаюцца ад справы, падыходзяць фармальна, ня цікавяцца жывой справай.

Каб сапраўды забясьпечыць бальшавіцкае выкананьне пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі наша задача заключаецца ў тым, каб абавязкова ўзмацніць канкрэтнае кіраўніцтва, прычым давесьці гэта канкрэтнае кіраўніцтва да прадпрыемстваў, да самага нізавога зьвяна. Гэта абавязковая задача—адна з галоўнейшых задач.

Напрыклад, трэба, каб ВСНГ ведаў, што робіцца ня толькі ў аб'яднаньні тэй ці іншай галіны прамысловасьці, але каб ён ведаў, што робіцца і на заводзе, каб рэспубліканскае аб'яднаньне ведала ня толькі тое, што робіцца на тым ці іншым заводзе, або фабрыцы, але каб яно ведала, што робіцца і ў кожным цэху і каб дапамагаць канкрэтна кожнаму цэху і кожнаму заводу ці фабрыцы, як выконваць прамфінплян як лепш арганізаваць вытворчасьць лепш расставіць людзей і правільна скарыстаць рабочую сілу.

Задача цэнтральных арганізацый заключаецца ў тым, каб дапамагаць дырэктару заводу, майстру таго ці іншага цэху, партыйнай ячэйцы, фабзаўкому і г. д. лепш наладзіць вытворчасьць.

Трэба таксама, каб і Наркамзямляробства і Калгасцэнтр ведалі ня толькі тое, што робіцца ў паасобных саўгасных аб'яднаньнях, або ў райкалгассаюзах, а трэба, каб яны ведалі, што робіцца і ў кожным саўгасе, у кожным калгасе, дапамагалі-б практычна работнікам саўгасаў і калгасаў на справе ажыцьцяўляць канкрэтную справу па арганізацыі вытворчасьці саўгасаў і калгасаў у выкананьні генэральнай лініі нашай партыі. Гэта значыць па-сапраўднаму, канкрэтна будаваць сацыялізм.

Вялікую ўвагу трэба аддаваць праверцы выкананьня пастаноў ЦК, СНК і ЭКАСА, а таксама праверцы выкананьня гаспадарчых дагавароў паміж арганізацыямі. У гэтым галоўная задача наладжваньня канкрэтнага кіраўніцтва вытворчасьцю і ўсёй гаспадарчай працай.

Гэта галоўнае зьвяно кіраўніцтва на 1932 г. Бяз гэтага мы будзем сьлізгаць па паверхні, будзем выносіць пышныя рэзалюцыі добрыя дэклярацыі і дэкрэты, але над гэтымі дэклярацыямі і рэзалюцыямі ня будзе жывой справы.

Абавязкова патрэбна перайсьці ад мэтадаў цыркулярных і пустых дэклярацый, якія часта ні аб чым не гавораць, да канкрэтнага кіраўніцтва работай з тым, каб гэта кіраўніцтва даводзілася да самага нізавога зьвяна. Так стаіць задача перабудовы кіраўніцтва па-новаму ва ўсёй нашай сацыялістычнай вытворчасьці.

На гэта павінны зьвярнуць галоўную ўвагу, на гэта павінны зрабіць націск усе нашы цэнтральныя і гарадзкія арганізацыі, у тым ліку гарком і гарсавет.

Трэба мець на ўвазе, што сухая цыркулярышчына, фармальныя пастановы, якія часта ні аб чым не гавораць, толькі зацямняюць жывую справу, перашкаджаюць яе праводзеньню ў жыцьцё. Таму мы павінны ацэньваць работу таго ці іншага працаўніка не па колькасьці вынесеных пастаноў або напісаных цыркуляраў, а па справах, як выканана тое ці іншае даручэньне партыі, як кажуць, судзіць не па словах, а па справах.

Чалавеку, які многа займаецца непатрэбнай пісанінай і ня робіць жывой справы, мы можам сказаць, што ты добра пішаш рэзалюцыі, коскі на месцы ставіш і нават пра апартунізм не забыў, а на справе нічога канкрэтнага ня робіш. Таму ты нікуды ня варты. Які-ж ты камуніст пасьля гэтага? Грош табе цана. Нам справа патрэбна, а не агульныя цыркуляры, пастановы, рэзалюцыі. Так зараз стаіць пытаньне з канкрэтным кіраўніцтвам і з канкрэтным ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі партыі.

Самым лепшым бальшавіцкім праводзеньнем генэральнай лініі нашай партыі ў жыцьцё зьяўляецца канкрэтная практычная работа па пабудове сацыялізму.

Нам патрэбна жывая праца, а не папяровая трэскатня, ня прыгожыя пустазвонныя словы.

У нас часта многія працаўнікі, дый некаторыя арганізацыі зьбіваюцца на ілжывы шлях і карпеюць выключна над тым, каб у іх пастанове ня было ні сучка, ні задорынкі. Зразумела, што трэба добрыя бальшавіцкія пісаць фармулёўкі ва ўсіх нашых дакумантах, тым больш абавязкова неабходна, каб ва ўсіх пастановах савецкіх, гаспадарчых і партыйных арганізацый чырвонай істужкай праходзіла-б генэральная лінія нашай партыі. Гэта абавязковая ўмова для кожнага камуніста, дзе-б ён не працаваў. Але адных пастаноў, нават і з добрымі фармулёўкамі зусім мала, бо калі мы будзем сядзець толькі над пісанінай і ня будзем даваць канкрэтнай работы па арганізацыі сацыялістычнай вытворчасьці, то на справе гэта будзе азначаць, што мы за ўсякую цыркулярскую пісаніну будзем хавацца, як за шырму. А на справе гэта будзе чысьцейшай маркі апартунізмам, фармальным падыходам да справы. Такія людзі заўсёды гавораць, калі пачынаеш правяраць іх работу, што вось я тады і тады так рэагаваў на дырэктыву партыі, такую і такую пастанову вынес, правільна яе запісаў і г. д. А на справе што атрымалася? Аказваецца, што яго ня цікавіла, што-ж выйшла з яго пастановы, як яна праведзена ў жыцьцё. Звычайна, такія людзі адгаворваюцца тым, што я вынес пастанову, а мяне не паслухалі. Грош цана такім работнікам (воплескі).

Не па рэзалюцыях, і не па літарах мы павінны ацэньваць работу кожнага працаўніка, а па справах. Усе мы ведаем, што галоўнай і генэральнай задачай нашай партыі зьяўляецца задача пабудовы сацыялізму ў нашай краіне, а ў 1931 г. такой задачай зьяўлялася задача завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай экономікі.

Мы зараз дабіліся таго, што з задачай завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай экономікі справіліся.

На наступны час генэральнай палітычнай задачай, якая стаіць перад нашай партыяй, зьяўляецца задача—перайсьці на вышэйшую ступень у справе будаўніцтва сацыялізму. Гэта значыць, падрыхтаваць глебу для канчатковага выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў. І калі той ці іншы член партыі на справе будуе сацыялістычную экономіку, а ня ў голых рэзалюцыях, то гэта і ёсьць сапраўдны бальшавік, сапраўдны сталінец і ленінец. А хто толькі сядзіць і піша цыркуляры і рэзалюцыі, б'е сабе ў грудзі і крычыць, што ён цьвёрды чалавек, ды чапляецца за літару, калі яна ня так пастаўлена, ды балбоча ўпустую, то такая трэскатня нам непатрэбна (воплескі).

Вось таму я лічу, што задача II-й менскай партыйнай канфэрэнцыі заключаецца ў тым, каб зрабіць яшчэ больш паварот Менскай партыйнай арганізацыі ў бок выкананьня канкрэтнай справы, якая вынікае з генэральнай лініі нашай партыі. А гэта азначае—на справе забясьпечыць бальшавіцкае ажыцьцяўленьне гэтай генэральнай лініі, памятаючы тое, што генэральная лінія партыі павінна ажыцьцяўляцца ня толькі ў рэзалюцыях, а канкрэтнай бальшавіцкай працай (воплескі).

Трэба, каб кожны член Менскай партыйнай арганізацыі, як кажуць, закасаўшы рукавы, біўся за справу, за канкрэтную работу, за сацыялістычную экономіку, ведаючы аб тым, што сацыялістычная экономіка будуецца канкрэтнай працай на розных участках будаўніцтва.

Яна заключаецца ў 100-проц. выкананьні плянаў індустрыялізацыі, у выкананьні прамфінпляну, добрым наладжваньні работы ў саўгасах і калгасах і наогул у канкрэтным вырашэньні важнейшых эканамічных праблем нашая пралетарская дзяржава.

І так, за канкрэтную работу, на падставе генэральнай лініі нашай партыі, супроць пустой балбатні. Вось асноўны лёзунг, які стаіць перад Менскай арганізацыяй.

ЗАДАЧЫ АЎЛАДАНЬНЯ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ

Апошняе, на чым я хачу спыніцца, гэта—на чацьвертай важнейшай задачы, якая стаіць перад Менскай партыйнай арганізацыяй, — на пытаньні барацьбы за аўладаньне марксыцка-ленінскай тэорыяй і за вывучэньне гісторыі бальшавіцкай ленінскай партыі.

Кажучы словамі тав. Сталіна, марксыцка-ленінская тэорыя ў нашай працы патрэбна нам, як паветра, як вада. Тав. Сталін гаварыў ня раз, што практыка, неасьветленая марксыцка-ленінскай тэорыяй, — гэта значыць працаваць усьляпую, а камуніст не можа і не павінен працаваць усьляпую.

Наша партыя ёсьць самая рэвалюцыйная партыя ў сьвеце, зьяўляючыся авангардам рэвалюцыйнай клясы—пралетарыяту.

Таму кожны член нашай партыі ня можа працаваць, не аўладаўшы тэорыяй марксызму-ленінізму. Значыць, задача кожнага члена партыі і кожнага пралетара заключаецца ў тым, каб аўладаць вышынямі марксыцка-ленінскай тэорыі. Гэта адна з галоўнейшых і асноўных задач, якую павінна паставіць перад сабою ўся Менская партыйная арганізацыя.

Тав. Сталін у сваім лісьце ў часопіс «Пролетарская революция» вельмі востра паставіў задачу вывучэньня гісторыі бальшавіцкай партыі, вывучэньня марксыцка-ленінскай тэорыі. Ён таксама паставіў задачу барацьбы з трацкісцкай кантрабандай і з гнілым лібэралізмам, які дапускае працягваньне гэтай кантрабанды.

З гэтага мы павінны зрабіць належны ўрок і сыстэматычна, па-бальшавіцку вывучаць гісторыю бальшавізму і аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй, бо марксызм і ленінізм вучаць нас будаваць сацыялізм. Вывучаць нам тэорыю ленінізму і гісторыю бальшавіцкай партыі трэба для таго, каб мы на справе будавалі сацыялізм, каб мы, узброіўшыся гэтай тэорыяй, цаглінку за цаглінай укладалі-б у будынак сацыялістычнай экономікі.

І ў гэтым разрэзе я стаўлю лёзунг такі — каб на справе змагацца за канкрэтную работу, узброіўшыся тэорыяй марксызму-ленінізму.

Ліст тав. Сталіна ў першую чаргу ставіць сваёй мэтай падняць сьвядомасьць усіх камуністаў, у першую чаргу актыву нашай партыі і гісторыкаў марксыстаў на належную ступень у справе вывучэньня гісторыі нашай партыі ў справе вывучэньня марксызму-ленінізму. У той-жа час неабходна адзначыць, што некаторыя члены партыі не зразумелі сапраўднай мэты, пастаўленай лістом тав. Сталіна, і замест паглыбленай барацьбы за вывучэньне гісторыі нашай партыі пачалі сьлізгаць па паверхні і думалі задачу, пастаўленую лістом тав. Сталіна, выканаць шляхам выкідваньня паасобных членаў партыі, якія памыліліся, з радоў партыі.

Тав. Постышаў у сваёй прамове на раённай партканфэрэнцыі ў Маскве з усёй рэзкасьцю паставіў гэта пытаньне, паказаўшы, што многія зьбіліся на ілжывы шлях, думаючы, што калі яны выганяць усіх, што памыліліся, з партыі, тады можна сесьці і спакойна сядзець. Паўтарацца я ня буду бо ў тав. Постышава ярка пастаўлена гэта пытаньне, але я заклікаю Менскую партыйную канфэрэнцыю па-сапраўднаму падняць сваю сьвядомасьць, каб па-бальшавіцку вывучыць гісторыю нашай партыі, каб па-бальшавіцку аўладаць марксыцка-ленінскай тэорыяй і ня зьбівацца на такі шлях, як гэта дапусьцілі і ў нас некаторыя члены Менскай арганізацыі, калі яны выкідалі лёзунг «гнаць усіх, што памыліліся, з радоў партыі» нават і тады, калі гэтыя людзі прызнаюць свае памылкі.

А гэта значыць, што і ў гэтай рабоце нельга зьбівацца на мёртвую літару і падыходзіць да такой важнейшай справы з кандачка.

Канчаючы, я хачу зрабіць з маёй прамовы вывад, што плян чацьвертага, заключнага году пяцігодкі павінен быць выканан і перавыканан, чаго-б гэта не каштавала. Аб гэтым трэба памятаць з першага месяца новага гаспадарчага году не залазьце ў запазычанасьць дзяржаве, бо калі недавыкананьне ў першым месяцы прамфінпляну, дык тым самым залезеце ў запазычанасьць і цяжка будзе ў другім месяцы ліквідаваць гэту запазычанасьць, значыцца, трэба з першага-ж месяца новага году змагацца па-бальшавіцку за выкананьне і перавыкананьне пастаўленых задач.

Трэба канкрэтна кіраваць усёй гаспадаркай, а таксама і партыйнай работай. Ад мэтадаў цыркулярышчыны і сухой бюрократычнай перапіскі на справе перайсьці да жывога кіраўніцтва да жывой справы.

Трэба па-сапраўднаму аўладаць тэхнікай, на кожным кроку ўкараняючы яе ў сацыялістычную вытворчасьць. Яшчэ больш узьнімаць творчы энтузіязм і ініцыятыву рабочых мас, бо рэзэрвы творчай ініцыятывы рабочае клясы ў нас вялізарныя. Трэба ўмець арганізаваць і падняць гэту творчую ініцыятыву пралетарыяту.

Апрача таго неабходна абавязкова, па-сапраўднаму арганізаваць партыйную вучобу, партвыхаваньне, арганізаваць работу па вывучэньні гісторыі нашай бальшавіцкай партыі і тэорыі Маркса-Леніна.

Менская арганізацыя ў сваёй рабоце ў 1931 г. паказала цэлы рад добрых прыкладаў барацьбы за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Я ўпэўнен у тым, што Менская арганізацыя паставіць сабе задачу і ў 1932 г. выконваць усе народна-гаспадарчыя пляны на ўсе 100 проц. і быць першай і перадавой арганізацыяй сярод усёй КП(б)Б.

Я ўпэўнен у тым, што Менская арганізацыя, вядучы барацьбу на два фронты, з правым і «левым» апартунізмам, за генэральную лінію партыі гэту задачу выканае з гонарам (працяжныя воплескі).

Агляд друку

„ПЛЯН ВЫКАНАН...“

(„РАБОЧАЕ ВОКА", Менск; „РАТАЦЫЯ", Гомель)

Нізавы фабрычна-заводзкі друк БССР горача падхапіў ініцыятыву «Праўды», якая абвясьціла конкурс на лепшае выкананьне задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Конкурс «Праўды» стаў рухавіком барацьбы нізавога друку за бальшавіцкую арганізацыю калгаснай вытворчасьці.

Газэты заводаў і фабрык БССР праводзяць вялікую апэрацыйна-масавую работу, прымаючы непасрэдны ўдзел у ажыцьцяўленьні цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва — арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У гэту работу ўключыліся ня толькі ўдарныя брыгады фабрычна-заводзкага друку. Праваднікамі конкурсу сталі рабочыя масы. Брыгады заводаў і фабрык разам з работай па ўмацаваньні газэт саўгасаў, калгасаў і МТС разгортваюць упартую барацьбу за ўздым калгаснай вытворчасьці на вышэйшую ступень. Рабочыя брыгады з прадпрыемстваў Менску, Гомеля і Віцебску дабіліся ў падшэфных сельсаветах рэгулярнага выпуску штодзенак і карэннага пералому ў ходзе збожжазагатовак — гэтага баявога зьвяна арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Газэта «РАБОЧАЕ ВОКА» (гарбарня «Бальшавік», Менск) сыстэматычна асьвятляе ход конкурсу «Праўды», мабілізуючы масы на выразную арганізацыю вытворчасьці ў падшэфных калгасах. Ударныя брыгады «Р.В» выехалі ў Самахвалавіцкі і Гатаўскі сельсаветы (Менскі раён), дзе арганізавалі работу калгасных газэт і прынялі актыўны ўдзел у выкананьні загатоўчых плянаў. Да прыезду брыгад справы ў гэтых сельсаветах ішлі ня важна. Зрываўся плян збожжазагатовак. У паасобных калгасах існавалі кулацка-спажывецкія тэндэнцыі (с.-г. арцелі імя Акадэміі навук і «Ленінскі шлях»). Патрэбнага адпору гэтыя тэндэнцыі ня сустракалі. У рэзультаце—спробы скараціць пляны загатовак. Калгасныя газэты выходзілі ад выпадку да выпадку.

Брыгады «Р.В» у Самахвалавіцкім сельсавеце прынялі ва ўсіх калгасах

«... АГУЛЬНЫЯ СХОДЫ, ПАСЯДЖЭНЬНІ ПРАЎЛЕНЬНЯЎ І ГУТАРКІ З КАЛГАСЬНІКАМІ АБ АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ» («Рабочае вока» ад 30 сьнежня).

Шляхам масавай работы брыгады «Р. В» забясьпечылі рашаючы зрух у збожжазагатоўках, якія раней праходзілі з рук вон дрэнна.

«... ДА ПРЫЕЗДУ БРЫГАД ПЛЯН ЗАГАТОВАК БЫЎ ВЫКАНАН НА 37 ПРОЦ., ДА АД'ЕЗДУ-Ж ГЭТЫ ПРОЦАНТ СЫРАС ДА 89. РАД КАЛГАСАЎ ВЫКАНАЎ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК» («Р.В» № 32).

Такая-ж работа праведзена і ў Гатаўскім сельсавеце. Тут, пры дапамозе брыгад «Р.В», заваяваны яшчэ большыя перамогі на збожжазагатоўчым фронце. Сельсавет рашуча пакончыў са сваім адставаньнем і рапартаваў гарбарні «Бальшавік» праз «Рабочае вока» аб перавыкананьні загатоўчых плянаў:

«... ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН НА 103,6 ПРОЦ., ПЛЯН БУЛЬБАЗАГАТОВАК — НА 105,4 ПРОЦ. РЭАЛІЗАВАНЫ АКЦЫІ ТРАКТАРАЦЭНТРУ НА 6.360 РУБ. (ЗАДАНЬНЕ — 5.610 РУБ.»).

Брыгадзіры значна ўмацавалі і работу калгаснага друку. З іх дапамогай калгасныя газэты перайшлі ў конкурс «Праўды». У Самахвалавіцкім сельсавеце сіламі брыгад «Р. В».

«... ЗА ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН ВЫПУШЧАНА 12 ГАЗЭТ. АРГАНІЗАВАНЫ ШТОДЗЕННІ Ў 3 КАЛГАСАХ».

Ня меншыя посьпехі дасягнуты брыгадамі «РВ» і ў Гатаўскім сельсавеце. Брыгадзіры па-баявому арганізавалі работу штодзенак у калгасе імя Войкава і інш. с.-г. арцелях. З прыездам брыгад калгасныя газэты пачалі выходзіць рэгулярна.

«У КАЛГАСНЫХ ГАЗЭТАХ ЦЯПЕР ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ УВЕСЬ КАЛГАСНЫ АКТЫЎ. НАСЬЦЕННЫЯ ГАЗЭТЫ ЗАВАЯВАЛІ АЎТАРЫТЭТ У КАЛГАСЬНІКАЎ. ЦЯПЕР УЖО НЕ ПАЧУЕШ, ЯК БЫВАЛА РАНЕЙ, ШТО «ГАЗЭТА НАМ УСЕ РОЎНА НЕ ДАПАМОЖА». ЦЯПЕР РЭЗУЛЬТАТЫ ДЗЕЙНАСЬЦІ НАСЬЦЕНГАЗЭТ ВІДАВОЧНЫ І КАЛГАСЬНІКІ АХВОТНА ПІШУЦЬ У СВАЕ ГАЗЭТЫ. НАПРЫКЛАД, У ШТОДЗЕНЦЫ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНЫ БАЕЦ» БЫЎ ЗЬМЕШЧАН МАТАР'ЯЛ АБ ДРЭННЫМ ДОГЛЯДЗЕ ЖЫВЁЛЫ. РЭДКАЛЕГІЯ ДАБІЛАСЯ, ШТО НЕДАХОПЫ БЫЛІ ВЫПРАЎЛЕНЫ» («РВ» № 33).

«РАТАЦЫЯ» (Палесдрук, Гомель) у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў выкарыстала каштоўны вопыт, які павінен быць падхоплен усімі фабрычна-заводзкімі газэтамі. У адным з сваіх нумароў (126) газэта дала разгорнуты паказ работы брыгад друку ў падшэфным калгасе «Чангарская дывізія». Матар'ялы аб гэтым калгасе займаюць цэлых дзьве паласы. «Ратацыя» шырока паказала, як брыгады друку разгортвалі сваю работу па арганізацыі калгаснай вытворчасьці ў «Чангарскай дывізіі».

ДРЭННА, што і «Рабочае вока», і «Ратацыя» ў сваіх матар'ялах аб конкурсе нізавога друку ЗАБЫВАЮЦЬ аб такіх важнейшых звеньнях арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, як размеркаваньне даходаў і падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай вясны. Аб іх ні «Ратацыя», ні «Рабочае вока» фактычна нічога ня пішуць. Гэта бязумоўная памылка.

Фабрычна-заводзкі друк БССР—актыўны змагар за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Вопыт перадавых газэт трэба пашырыць на ўсе заводы і фабрыкі. Абавязак усяго нізавога друку — падвоіць тэмпы сваёй работы, каб дабіцца яшчэ большых перамог у барацьбе за арганізацыю калгаснай вытворчасьці.

Пагроза акупацыі Шанхаю

Японскі ўльтыматум

28 японскіх ваенных суднаў ідуць у Кітай

ШАНХАЙ, 23 студзеня. Японскі консул у Шанхаі Мураі прад'явіў мясцовым кітайскім уладам ультыматум, у якім патрабуе безадкладнага роспуску усіх арганізацый, якія вядуць антыяпонскую агітацыю і кіруюць байкотам (адмаўленьнем ад куплі) японскіх тавараў. Камандуючы японскім флётам у кітайскіх водах адмірал Шыёзава папярэдзіў кітайскія ўлады, што ў выпадку невыкананьня ўльтыматуму Мураі, ён прыме «рашучыя меры». Маркуючы па паведамленьнях японскага друку, гэтым «рашучым мерам» будуць азначаць выдаленьне ўсіх кітайскіх ваенных суднаў з Шанхайскага порту і блёкаду Шанхаю з мора. Сёньня ў Шанхаі чакаецца прыбыцьцё 6 японскіх ваенных суднаў. У ваенным порце Сасьбо (Японія) стаяць яшчэ 22 ваенныя судны з дэсантамі морскай пяхоты і самалётамі, гатовыя да адпраўкі ў кітайскія воды.

Ліга нацый выклікае ў кітайцаў „чувство омерзения“

ШАНХАЙ, 24. Уплывовая нанкінская газэта «Сін Уэйншы-Бао» піша, што камісія Лігі нацый, якая накіроўваецца ў Манчжурыю, ня сустрэне ў Кітаі добрага прыёму. Простыя ўспаміны аб Лізе, — зазначае газэта, — выклікаюць у кітайцаў «чувство омерзения». Паданьне Цзіньчжоу, — піша газэта, — канчаткова разбурыла рэшткі Лігі нацый. Атрымаўшы добры ўрок, кітайцы цяпер забылі, што існуе такая ўстанова, як Ліга нацый. Але, калі, — заключае газэта, — камісія прыбудзе ў Кітай, дык кітайцы аднадушна будуць прасіць яе вярнуцца туды, адкуль яна прыехала».

Баі ў раёне КУЧ

БЭЙПІН, 23 студзеня. Паводле вестак японскага міністэрства замежных спраў войскі Сі-Ся (кітайскі генэрал, які знаходзіцца на службе японскіх ваенных улад) занялі гор. Юйшу і пасоўваюцца на Харбін (галоўны горад Паўночнай Манчжурыі і важнейшы вузел Кітайска-Усходняй чыгункі). Для падтрыманьня наступленьня Сі-Ся адпраўлен атрад японскіх войск з трыма бранявікамі. Атрад пасоўваецца ўздоўж паўднёвага вучастку КУЧ. Учора японскі аэраплян бамбардаваў войскі праціўнікоў генэрала Сі-Ся ў раёне адной са станцый КУЧ.

Ёсьць весткі аб намеры японскіх ваенных улад захапіць Хухайскую дарогу (якая ідзе на поўнач ад Харбіну) і аддаць яе пад кіраўніцтва праўленьня, складзенага з рускіх белагвардзейцаў.

Фронт у паўднёвай Манчжурыі пашыраецца

ТОКІЕ, 24. Агенцтва Дзэнго Пусін паведамляе з Мукдэну, што «карная экспэдыцыя» «супроць бандытаў», прадпрынятая 22-га студзеня дывізіяй Муро ў раёне Гаубанзы, працягваецца з удзелам аэрасілы.

Агенцтва Сімбун Рэнга падае, што сёньня раніцой пачаліся апэрацыі другога буйнога «карнага атраду» ў раёне на захад ад чыгуначнай лініі Тухлло — Дахушань, а таксама ў раёне на поўнач ад Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі. У гэтых апэрацыях прымаюць удзел усе наяўныя аэрасілы.

**

У паўднёвай частцы Манчжурыі японскія войскі вядуць упартую барацьбу з партызанскімі атрадамі. Ёсьць весткі, што для барацьбы з партызанскім рухам японскія ваенныя ўлады арганізуюць шайкі бандытаў.

Генэрал Мітчэль аб япона-амэрыканскай вайне

НЬЮ-ЕРК, 22. Былы начальнік ваеннай авіяцыі ў ПАЗШ генэрал Мітчэль выступіў з артыкулам пад загалоўкам: «Ці гатовы мы да вайны з Японіяй». Мітчэль паказвае на немінучасьць япона-амэрыканскай вайны за панаваньне на Ціхім акіяне і патрабуе значнага павялічэньня амэрыканскіх ваенна-паветраных сіл. Паводле слоў Мітчэля, японскія гарады, пабудаваныя галоўным чынам з дрэва і папяровых матар'ялаў, «прадстаўляюць вельмі добрую мішэнь пры апэрацыях з паветра. Запальваючыя знарады хутка разбурылі-б гэтыя гарады. Паветраныя газавыя атакі поўнасьцю зьнішчылі-б насельніцтва з твару зямлі».

Адзначаючы далей, што «ў Азіі (дакладней — у Кітаі) насьпяваюць зараз насеньні вайны», Мітчэль паказвае, што ў сучасны момант вайна лепш, чым рэвалюцыя (для буржуазіі, зразумела).

КРЫЗІС СУСЬВЕТНАГА КАПІТАЛІЗМУ

Дэтройт і Чыкага—напярэдадні банкруцтва

НЬЮ-ЕРК, 23. Самакіраўніцтва гарадоў Детройт і Чыкага знаходзяцца напярэдадні банкруцтва, яны не могуць пакрываць нават бягучых выдаткаў. Муніцыпалітэт Чыкага выплачвае зарплату школьным работнікам папяровымі сэртыфікатамі, якія не прымаюцца ні банкамі, ні магазынамі. Іншыя буйныя гарады таксама шпарка набліжаюцца да банкруцтва. Муніцыпалітэты многіх гарадоў звальняюць сваіх служачых, урэзваюць зарплату, скарачаюць школьныя праграмы і скасоўваюць асыгнаваньні па беспрацоўі (ТАСС).

Пісьменьнікі і мастакі Латвіі галадаюць

РЫГА, 24. За апошнія дні на рыскай біржы працы зарэгістраваўся рад латыскіх пісьменьнікаў і мастакоў, галеча сярод якіх надзвычай вялікая. Сярод зарэгістраваных мастакоў Струнке, вядомы далёка за межамі Латвіі. Яму пагражае высяленьне з кватэры за нявыплату кватэрплаты.



НА ЗДЫМКУ: Дыяграма крызісу цяжкай прамысловасьці ў буйнейшых капіталістычных краінах.

Англія траціць пазыцыі на сусьветным рынку

ЛЕНДАН, 16. Апублікаваныя міністэрствам поўныя даныя за 1931 г. паказваюць, у якой меры Англія страціла свае пазыцыі на сусьветных рынках. Экспарт упаў да 40 проц. даваеннага, імпарт — да 70 проц. Найбольш моцнае падаеньне ў галіне экспарту прыходзіцца на гатовыя вырабы, а ў галіне імпарту — на сырыя матар'ялы.

**

ЛЕНДАН. Даныя, апублікаваныя «Нацыянальнай фэдэрацыяй прадпрыемцаў», жалезаапрацоўчай прамысловасьці сьведчаць аб значным скарачэньні выплаўкі сталі і чыгуну ў 1931 г. Усяго ў мінулым годзе было выплаўлена чыгуну 3.750.100 тон супроць 6.192.400 тон у 1930 годзе, 7.589.300 тон у 1929 г.

Сталі было выплаўлена 5.175.600 тон супроць 7.325.700 тон у 1930 г. і 9.627.200 тон у 1929 г.

Прадукцыя чыгуну ў 1931 г. складала адну трэцюю сярэдняй выплаўкі чыгуну ў даваенныя гады. Выплаўкі сталі ў параўнаньні з 1913 г. зьменшыліся на 50 проц.

Паўстаньне у Сальвадоры

ВАШЫНГТОН, 24. Тры амэрыканскіх, два канадскіх і 1 брытанскі ваенны карабель выйшлі ў Сальвадор, дзе паводле паведамленьняў друку выбухнула камуністычнае паўстаньне. У апублікаваным дзяржаўным дэпартамэнтам ПАЗШ (міністэрства замежных спраў) паведамленьні гаворыцца, што амэрыканскі давераны ў справах у Сальвадоры ў сваім дакладзе называе становішча ў Сальвадоры надзвычай сур'ёзным. Амэрыканскі давераны ў справах сьцьвярджае, што камуністы атакавалі горад Сансанатэ і, паводле чутак, вядуць баі ў Санта-Пэтля ў 8 мілях ад сталіцы. Тэлефонныя зносіны перарваны. Чыгунка каля Сансанату разбурана. Неабходна адзначыць, што амэрыканскія капіталаўкладаньні ў Сальвадоры складаюць каля 35 млн. даляраў.

Урад абвясьціў на ўсёй краіне стан аблогі. Паведамленьні друку аб падзеях у Сальвадоры вельмі нявыразныя, пярэчлівыя і не даюць уяўленьня ні аб сапраўдным характары руху, ні аб патрабаваньнях, якія высоўваюцца паўстанцамі. Маркуючы па некаторых паведамленьнях, у паўстаньні прымалі ўдзел галоўным чынам сяляне.

Эканамічны крызіс у Сальвадоры надзвычай абвастрыўся ў сувязі з рэзкім падзеньнем цэн на каву, якая зьяўляецца асноўнай культурай Сальвадору і галоўным прадметам вывазу. Сяляне зьбяднелі, беспрацоўе вялізарнае (ТАСС).

ГІШПАНІЯ Ў АГНІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ БАЁЎ

Войска і жандармэрыя супроць паўстаўшых

МАДРЫД, 23. Гішпанскі буржуазны друк у трывожных тонах публікуе паведамленьні АБ БАЯВЫХ ВЫСТУПЛЕНЬНЯХ НА ПОЎНАЧЫ БАРСЭЛЁНСКАЙ ПРАВІНЦЫІ ЛЯ ГІШПАНА-ФРАНЦУСКАЙ МЯЖЫ.

«Гэральда дэ Мадрыд» паведамляе, што ў Манрэсе (правінцыя Барсэлёны) і ў суседніх мясцовасьцях прафсаюзныя арганізацыі пастанавілі ўчора абвясьціць усеагульную рэвалюцыйную забастоўку. СЁНЬНЯ Ў МАНРЭСЕ І РАДЗЕ ІНШЫХ ПУНКТАЎ РАБОЧЫЯ АДНАДУШНА ЗАБАСТАВАЛІ. У МАНРЭСЕ БАСТУЮЧЫЯ ПАВАЛІЛІ ТЭЛЕГРАФНЫЯ СЛУПЫ І ПРАБАВАЛІ АЎЛАДАЦЬ ХАРЧОВЫМІ МАГАЗЫНАМІ. У ВЁСКАХ БЭРГА, САЛІЕНТ, ПУЙК, РЭЙК, БАЛЬСАРОНЕ, НАВАС, СУРЫЯ І ІНШЫХ МЯСЦОВАСЬЦЯХ БАСТУЮЧЫЯ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАХАПІЛІ ЎЛАДУ Ў СВАЕ РУКІ. Ва ўсіх гэтых мясцовасьцях бастуючыя раззброілі «саматэністаў» (добраахвотная паліцыя). У Бэрга і іншых мясцовасьцях бастуючыя захапілі муніцыпальнае кіраўніцтва. У Наварклесе бастуючымі захоплена тэлефонная станцыя. У САЛІЕНЦЫ РАЗАБРАНЫ ЧЫГУНАЧНЫ ШЛЯХ І ЗАХОПЛЕН СКЛАД ВЫБУХОВЫХ МАТЭРЫЙ. У СУРЫІ БАСТУЮЧЫЯ НАПАЛІ НА ДВА АРСЭНАЛЫ.

Кіраўнік ураду АСАНЬНЯ выступіў у парляманце з заявай, у якой падкрэсьліў: «НАЧАЛЬНІКУ ЭКСПЭДЫЦЫІ (КАРНАЙ) Я ДАЎ 15-ЦІ ХВІЛІННЫ ТЭРМІН ПАМІЖ ПРЫБЫЦЬЦЁМ ЯГО СІЛ ДА МЕСЦА ХВАЛЯВАНЬНЯЎ І ІХ ЗАДУШЭНЬНЕМ». Парлямант падтрымаў урад і па ініцыятыве Моўры (былога міністра ўнутраных спраў у габінэце Замора) вынес вотум давер'я большасьцю 289 галасоў супроць 4.

У апошніх паведамленьнях падкрэсьліваецца, што Ў МАНРЭСЕ «АДНОЎЛЕН ПАРАДАК» АЛЕ, ШТО СТАНОВІШЧА ЗАСТАЕЦЦА СКЛАДАНЫМ У БЭРГА І Ў ІНШЫХ ПУНКТАХ. У БАРСЭЛЁНЕ ЎЛАДАМІ ПРЫНЯТЫ МЕРЫ «ПЕРАСЬЦЯРОГІ» І ЗРОБЛЕНЫ ШМАТЛІКІЯ АРЫШТЫ. Друк публікуе афіцыяльнае паведамленьне аб тым, што ноччу ў раён Манрэсы прыбылі вайсковыя часьці, пасланыя туды для задушэньня рэвалюцыйнага руху. АД НАЧАЛЬНІКА КАРНАЙ ЭКСПЭДЫЦЫІ АТРЫМАНА ТЭЛЕГРАФНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АБ ТЫМ, ШТО ЁН ПРЫСТУПІЎ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ЗАГАДУ, ДАНАГА ЯМУ УРАДАМ.

Грамадзянскі губэрнатар Барсэлёны паведаміў, што войскам аддадзены надзвычайны загад. Начальнік карнай экспэдыцыі генэрал Батэт падкрэсьліў, што «войскі не пашкадуюць ні ганьбы, ні праз і ня толькі фактамі, але і на словах».

Сацыял-фашысцкі «УСЕАГУЛЬНЫ РАБОЧЫ САЮЗ» апублікаваў дэклярацыю, у якой абвяркоўвае забастовачны рух і рэкамендуе сваім прыхільнікам не прымаць удзелу ў забастоўках, не ўхваленых ім.

За пратэст супроць закоўваньня ў ланцугі—катарга

ВІЛЬНЯ, 21. У Віленскім Акруговым судзе адбыўся на днях цікавы палітычны працэс. Разглядалася справа палітзьняволенага Ш. Зырмана па абвінавачаньні ў тым, што 29-га верасьня 1931 г. ён, пасьля зацьвярджэньня прыгавору Віленскім апэляцыйным судом — 4-х гадоў катаргі, ідучы з паліцэйскім у турму — «лёг на сярэдзіне цэнтральнай вуліцы гораду і пачаў крычаць: «Прэч фашысцкі ўрад», «прэч белы тэрор», «прэч паліцыю». Пракурор дамагаўся суровага пакараньня «непапраўнага камуніста».

Падсудны вінаватым сябе ня прызнаў, заяўляючы, што як палітычны зьняволены ён пратэставаў супроць закоўваньня яго ў ланцугі. Фашысцкім судом Ш. Зырман засуджаны за гэты пратэст на 2 гады катаргі. Кару гэту падсудны павінен будзе адбыць дадаткова па сканчэньні ранейшых 4-х год.

Падобныя справы — масавае зьявішча ў Польшчы. У сувязі з увядзеньнем новага турэмнага рэгляманту, скасавана катэгорыя палітычных зьняволеных. Да асуджаных рэвалюцыянэраў турэмная адміністрацыя і паліцыя адносяцца, як да крымінальных злачынцаў. Палітычных закоўваюць у ланцугі, зьбіваюць і зьдзекваюцца над імі. З кожным праяўленьнем «новых парадкаў» палітзьняволеныя вядуць гераічную барацьбу.

60 банкруцтваў у Вільні за першую палову студзеня

ВІЛЬНЯ, 23. «Дзеньнік Віленскі» паведамляе, што за першую палову студзеня ў Вільні збанкрутавала 60 прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў. Беспрацоўе расьце. Яно ў апошнія дні асабліва шпарка ахапляе пекараў. Сярод гэтай катэгорыі рабочых процант беспрацоўных дасягнуў 30. Лічба гэта павялічыцца на днях, бо ў бліжэйшыя дні закрываецца 45 новых пекарань.

Ад народнага камісарыяту па замежных справах

25 студзеня народным камісарам замежных спраў тав. ЛІТВІНАВЫМ і польскім пасланьнікам у Маскве п. ПАТЭКАМ парафіраваны (змацаваны ініцыяламі) ДАГАВОР АБ НЕНАПАДЗЕ паміж Саюзам ССР і польскай рэспублікай.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД БРЫГАД „ПРАЎДЫ“, ЦКК НК-РСІ БССР, „ЗЬВЯЗДЫ“ І „СОЦИАЛИСТИЧЕСКОГО ЗЕМЛЕДЕЛИЯ“ ПА ПРАВЕРЦЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Падрыхтоўцы да сяўбы—бальшавіцкі разгон

НАСЕНЬНЕ, ТРАКТАР, КАНЯ І ПРЫЛАДЫ У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

Патрэбен круты пералом

У надыходзячую веснавую сяўбу БССР павінна засеяць 2.850 тыс. гектараў, з іх 1.850.000 гект. у сацыялістычным сэктары. Яравы клін у параўнаньні з мінулым годам павялічваецца на 24,5 проц.

У выкананьні праграмы чацьвертага, заключнага году пяцігодкі веснавая сяўба 1932 году будзе мець вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне. Партыяй і ўрадам пастаўлен перад краінай рад адказнейшых задач па ўзьняцьці ўраджайнасьці, павышэньні якасных паказальнікаў у сельскай гаспадарцы, укараненьні агратэхнікі і ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў тав. Сталіна ў саўгасах, калгасах і МТС.

Ураджайнасьць збожжавых культур трэба ўзьняць на 12 проц., тэхнічных культур — на 15 проц., бульбы — на 20 проц. Прадукцыйнасьць жывёлы трэба ўзьняць не менш, чым на 20 проц.

На выкананьне колькасных і асабліва якасных паказальнікаў веснавой с.-г. кампаніі 1932 году павінны быць мабілізаваны шматмільённыя масы працоўных гарадоў і вёскі, увесь партыйна-савецкі актыў, навуковыя і агранамічна-тэхнічныя сілы краіны.

Аднак, рэйд ударных брыгад па праверцы падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы, праведзены ЦКК-НК РСІ БССР і «Зьвяздой», паказаў, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб веснавой с.-г. кампаніі 1932 году яшчэ ня стала баявой праграмай дзейнасьці цэлага раду нашых цэнтральных зямельна-калгасных органаў.

Большасьць цэнтральных устаноў яшчэ не мабілізавала свайго апарату на фарсаваньне тэмпаў падрыхтоўкі да сяўбы — склалі пляны, далі дырэктывы і на гэтым супакоіліся. Як-жа пляны праводзяцца ў жыцьцё, дзе найбольш слабыя ўчасткі — ва ўстановах дакладна ня ведаюць. Наглядаецца адарванасьць раду цэнтральных установаў ад нізоўкі і адсюль няведаньне сапраўднага стану рэчаў на месцах.

Своечасовае давядзеньне плянаў асноўных мерапрыемстваў да саўгасаў і калгасаў, шырокае абгаварэньне іх на сходах калгасьнікаў і саўгасных рабочых зьяўляецца адной з умоў паспяховай падрыхтоўкі да сяўбы. Між тым, матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, сьведчаць, што рад устаноў нават не давялі плянаў важнейшых мерапрыемстваў да раёнаў. Напрыклад, Трактарацэнтр яшчэ не даслаў да МТС канчатковых плянаў засеву яравога кліну, вытворча-фінансавыя пляны малочных і сьвінагадоўчых калгасных ферм на 1932 год яшчэ ўзгадняюць па калгасных Малакацэнтру і Сьвінаводцэнтру. Белкалгасцэнтр не даслаў да калгасаў норм выпрацоўкі на 1932 год. У трэсьце Сьвінавод нормы выпрацоўкі нават ня складзены, там усё яшчэ чакаюць. Зноў паўтараюцца летатнія памылкі, калі спазьненьне з давядзеньнем плянаў да нізоўкі адбілася на тэмпах падрыхтоўкі да сяўбы.

Рамонт трактараў і машын выключна марудна. Па МТС, напрыклад, праграма рамонту выканана толькі на 10 проц. Рэшта устаноў дакладных вестак аб ходзе рамонту трактараў і машын ня мае.

Недаацэнка і ігнараваньне конскай цягавай сілы яшчэ ня выкаранены ня толькі з нізавых арганізацый, але і з некаторых цэнтральных. Трактарацэнтр не зрабіў ніякіх вывадаў з практыкі зяблева, калі неўмелае скарыстаньне конскай і трактарнай цягавай сілы адбілася на выкананьні заданьняў. І зараз Трактарацэнтр не распрацаваў ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў па скарыстаньні цягавай сілы калгасаў. Ігнараваньне коні, дрэнны догляд, абязьлічка на стайнях — прывялі да вельмі напружанага становішча з цягавай сілай у саўгасах Сьвінавода.

Рэйд ударных брыгад ЦКК-НК РСІ і «Зьвязды» з усёй відавочнасьцю выявіў, што рад зямельна-калгасных устаноў усё яшчэ кіруюць метадамі «спусканьня» плянаў, г. зн. такімі метадамі, якія тав. Сталін ахарактарызаваў, як «папяровае» кіраўніцтва, як кіраўніцтва «наогул». Напісалі добры дэкрэт, далі добрую дырэктыву, а за тым, як яна выконваецца, ніхто не сочыць.

Такога становішча ў справе падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай весны больш нельга цярпець. Трэба абясьпечыць бязьлітасную барацьбу фармальным адносінам да важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Трэба крута павярнуць цэнтральныя зямельна-калгасныя ўстановы тварам да саўгаснай і калгаснай вытворчасьці і на аснове рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна палепшыць тэмпы падрыхтоўкі да вясны.

Наркамзем БССР

Правільна арганізаваць работу, па-новаму кіраваць!

У надыходзячую вясну трэба засеяць яравы клін у 2.850.000 гэкт. Бліжэйшыя тры месяцы вырашаюць посьпехі вясны. У штабе пасеўнай — апараце Наркамзему — пакуль што усё спакойна. Прыгожыя цыркуляры, рэзалюцыі камісій, падкамісій не парушаюць агульнага спакою.

Дырэктывы спушчаны — хорам адказваюць кіраўнікі шматлікіх сэктараў. Дырэктывы сапраўды дасланы. Тэрміны выкананьня некаторых дырэктыў прайшлі, праходзяць, пройдуць. А што канкрэтна зроблена ў раёнах, сельсаветах, калгасах і саўгасах? Гэта «сакрэт». Ня ведаюць, ня цікавяцца нізоўкай, лёсам дасланых дырэктыў. Мабыць, работнікаў апарату НКЗ не датычаць словы Ільліча: «Правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы — у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым стрыжань усёй работы, усёй палітыкі». Без кантролю і праверкі людзей і спраў Наркамзем ня здолее апэрацыйна кіраваць пасеўнай.

Рыхтавацца да вясны, гаспадарча умацоўваць сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі, значыць правільна арганізаваць працу — ажыцьцявіць 6 гістарычных умоў тав. Сталіна. Аднак апарат НКЗ не павярнуўся яшчэ тварам да пасеўнай, не перабудаваўся, не навучыўся працаваць па-новаму, у новай абстаноўцы.

Сэктар арганізацыі працы — пустое месца. Ёсьць загадчык, ёсьць намесьнік, але няма работы. Аб дырэктыве ЦК КП(б)Б і СНК, якою прапанавана Наркамзему на працягу дэкады распрацаваць канкрэтную праграму мерапрыемстваў па далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, зусім забылі. Дэкада прайшла, другая пачалася, праграма не распрацавана. Калегія НКЗ не зьбіраецца, а Сідаровіча гэта менш за ўсё турбуе. ЦК пастанаўляе, а ў Наркамземе дырэктывы ня выконваюць.

Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца цэнтральнай задачай. Між тым, 6.269 калгасаў канчаткова не размяркавалі ўраджаю, 2.467 не вядуць уліку працадзён, 1.149 не забясьпечаны працоўнымі кніжкамі, 1.203 калгасы не пераведзены на зьдзельшчыну. Яшчэ не дасланы для ўсіх калгасаў формы ўліку і працоўныя кніжкі на 1932 год, не ўдасканалены нормы выпрацоўкі.

Недахват кадраў — адно з самых вузкіх месц сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Плян падрыхтоўкі кадраў 1931 году ня выкананы. Замест 61.000 падрыхтавана 43.000 чал. У гэтым годзе да веснавой сяўбы трэба падрыхтаваць 87.229 чал. ніжэйшай кваліфікацыі і 84.779 сярэдняй кваліфікацыі. Сэктар кадраў НКЗ «спусьціў плян у нізоўку» і на гэтым паставіў кропку. Дзе, як, колькі курсаў, на якія сродкі, якія праграмы, падручнікі, хто будзе выкладаць, якасьць работы, склад курсантаў — усё гэта прайшло міма НКЗБ. Да гэтага часу не зацьверджан бюджэт на падрыхтоўку масавых кадраў. 21 раён паведаміў НКЗБ, што курсы сьвінароў з-за адсутнасьці грошай зрываюцца. Праблема якасьці, палепшаньне ўраджайнасьці — асноўнае зьвяно ва ўзьняцьці калгаснай вытворчасьці на вышэйшую ступень. Прамова тав. Якаўлева аб барацьбе за ўраджай не знайшла свайго адлюстраваньня ў працы НКЗБ. Практычная праграма аграмерапрыемстваў не распрацавана. Бюро ЦК і СНК абавязала Наркамзем на працягу 1932 году ўвесьці севазварот ва ўсіх старых і нова-арганізаваных калгасах і саўгасах.

Між тым, НКЗБ яшчэ не распрацаваў тыпавых севазваротаў для спэцыялізаваных гаспадарак. Адсутнасьць севазваротаў тармозіць складаньне вытворча-фінансавых плянаў на 1932 год.

Паводле зацьверджанага НКЗ СССР пляну, да веснавой сяўбы ў саўгасы і калгасы павінна быць завезена 70.000 тон штучнага ўгнаеньня. Пакуль што саўгасы забясьпечаны на 11 проц., а калгасы — на 3 проц. Дастаўка ўгнаеньня ідзе вельмі марудна. На розных станцыях стаяць 75 неразгружаных вагонаў (Смалявічы — 20, Фаніпаль — 12, Камунар — 20 і г. д.). Некаторыя калгасы і райкалгассаюзы маюць запазычанасьць перад заводамі на 80.000 руб. На месцах ёсьць 9.000 тон летапняга ўгнаеньня, якое не скарыстана і зараз ляжыць і псуецца. Да вясны трэба было сабраць 30.000 тон попелу — такавы дырэктывы партыі. Тры з паловай месяцы прайшло зімовага сэзону і толькі 12 студзеня НКЗБ рассылае плян збору попелу. Колькі яго сабрана — ня ведаюць.

Апарату Наркамзему трэба зараз-жа перабудаваць сваю работу па-новаму, прыступіць да канкрэтнага штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да трэцяй бальшавіцкай вясны. Паставіць праблему барацьбы за якасьць, за ўраджайнасьць у цэнтр увагі кожнага работніка, кожнага апаратчыка. Распрацаваць праграму прэміяваньня таварамі, грашыма, дыплёмамі, ганаровымі граматамі калгасаў і саўгасаў, аграспэцыялістаў, рабочых і калгасьнікаў за лепшыя якасныя паказальнікі па ўзьняцьці ўраджайнасьці, павышэньні прадукцыйнасьці жывёлы. Шырока папулярызаваць праз с.-г. выстаўкі, часопісы, брашуры, лістоўкі лепшую с.-г. практыку, лепшых барацьбітоў за якасьць.

Шырокай мабілізацыяй партыйных арганізацый, калгасных мас і рабочых саўгасаў, наладжваньнем апэрацыйнага кіраўніцтва — забясьпечым баявую падрыхтоўку, поўнае выкананьне як колькасных, так і асабліва якасных плянавых паказальнікаў трэцяй бальшавіцкай вясны.

Брыгада: Баньдкоўскі, Бравэрман, Волгіна, Вожаў, Гублер, Гурчонак, Гурэвіч, Лагіновіч, Матулішава, Машыцкі, Маўчанскі, Прусак, Сырэц.

Калгасцэнтр

ДЗЕ-Ж АДКАЗНЫ ЗА АГРАТЭХНІКУ?

Да апублікаваньня пастановы ЦК і СНК аб пасеўнай кампаніі да калгасу былі даведзены кантрольныя лічбы па пасевах, стварэньні розных фондаў, сортаабмену і г. д. Але канчаткова вытворчыя заданьні пачалі спускацца толькі з 1-га студзеня г. г. Канкрэтна па аграмерапрыемствах дырэктывы спушчаны Белкалгасцэнтрам у раёны толькі 7-га студзеня.

Для складаньня вытворча-фінансавых плянаў у калгасах Калгасцэнтрам зараз праводзяцца толькі міжраённыя вытворчыя нарады ў Віцебску, Менску, Магілеве і Мазыры. На гэтых нарадах працавалі загадчыкі Райза, старшыні РКС, дырэктары МТС і аграномы. Непасрэднае складаньне вытворчых плянаў па калгасах з боку Белкалгасцэнтру не забясьпечана неабходным жывым кіраўніцтвам.

Яшчэ зусім не распрацавана пытаньне аб севазваротах, тыпы якіх выпрацоўваюцца інстытутам рэканструкцыі сельскай гаспадаркі разам з Калгасцэнтрам. Ёсьць пакуль што толькі праекты тыпаў севазвароту па ільнаводчых раёнах, але-ж яны яшчэ не разгледжаны і не зацьверджаны. Ня дана ніякіх указаньняў раёнам аб тэрмінах пасеваў.

Трэба сказаць, што Белкалгасцэнтр у сэнсе апэрацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да веснавой сяўбы жыве ў пацёмках, ніякіх вестак ня мае і будзе мець іх толькі тады, калі НКЗБ пачне атрымліваць зводкі з раёнаў.

Як ня дзіўна, але Калгасцэнтр ня мае пляну рамонту с.-г. машын у калгасах і зусім ня кіруе рамонтнай кампаніяй.

Ня лепш і з падрыхтоўкай кадраў (брыгадзіраў, сьвінароў, насеннаводаў і г. д.). Укамплектаваньне раённых курсаў праходзіць незадавальняюча. Так, паводле вестак некаторых раёнаў, на курсы брыгадзіраў-жывёлаводаў павінна быць паслана 3.200 чал., паслана-ж толькі 1.200. На курсах даярак замест 3.000 чал. вучыцца толькі 519. Калгасныя пляны прыладжаных курсаў не прадугледжваюць арганізацыю ў першую чаргу тых курсаў, якія патрэбны для праводжаньня веснавой сяўбы (насеннаводы, палыяводы, кіраўнікі калгасаў і г. д.). Зацьверджаным падрыхтаваньнем па лініі камунсоюза ахапіць 24.165 чал., але-ж ніякай работы па падрыхтоўцы і праводжаньні гэтага мерапрыемства з боку Калгасцэнтру не праведзена.

Масавая работа ці арганізацыя гурткоў у калгасах, па вывучэньні і укараненьні агратэхнікі не праводзіцца. На запытаньне брыгад Дагатуль Белкалгасцэнтрам ня спушчана дырэктыва аб складаньні фінпляну у калгасах і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Дырэктыва гэта пакуль што ляжыць яшчэ ў фінсэктары Белкалгасцэнтру. Па лініі Малакакалгасцэнтру і Сьвінаводкалгасцэнтру яшчэ ня спушчаны вытворча-фінансавыя пляны ў формы на 1932 г. нібы ў сувязі з тым, што гэтыя пляны затрымаліся ў Маскве, а на самой справе пляны былі атрыманы 16-га сьнежня 1931 году.

Калгасы яшчэ не атрымалі норм выпрацоўкі на 1932 г. па ўсіх галінах работы.

Усе гэтыя факты гавораць, што пытаньні падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі ня сталі ў цэнтр увагі. Белкалгасцэнтр павінен па-баявому ўзяцца за работу і забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва важнейшай кампаніяй.

Брыгада: Белюс, Расохін, Капланович, Леў, Шазман, Яфрэменка, Кац, Гальперына, Рубашова, Ляйкова.

У ЧАСЕ УСЕБЕЛАРУСКАГА РЭЙДУ ПА ПРАВЕРЦЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ АПРАЧА НАРКАМЗЕМУ І КАЛГАСЦЭНТРУ БРЫГАДЫ ПРАВЕРЫЛІ: ТРЭСТ СЬВІНАВОД, МАЛАКАПРАМТРЭСТ, ТРАКТАРАЦЭНТР, НАСЕНТРЭСТ, БЕЛСЕЛЬСНАБ, БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ШТУЧНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ. МАТАР'ЯЛЫ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ ГЭТЫХ УСТАНОЎ БУДУЦЬ ЗЬМЕШЧАНЫ Ў БЛІЖЭЙШЫХ НУМАРОХ ГАЗЭТЫ.

Падарунак XIV зьезду

Прэм'ера „Напор“—у БДТ-2

ГОМЕЛЬ, 25. Першыя пастаноўкі п'есы пралетарскага пісьменьніка Андрэя Александровіча ў другім Беларускім Дзяржаўным Тэатры — прэм'ера «Напор» праходзяць з вялікім посьпехам. Пралетарыят і працоўныя масы Гомелю праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да новай пастаноўкі тэатру і да ўсёй яго работы.

Калектыў актораў і работнікаў БДТ-2 працаваў над новай пастаноўкай — п'есай Андрэя Александровіча — сапраўды ўдарнымі тэмпамі і прысьвячае яе XIV зьезду КП(б)Б.

22 студзеня ў Гомель прыехалі і прысутнічалі на пастаноўцы: інтэрнацыянальная брыгада пісьменьнікаў брацкіх нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу — у складзе т. т. Амаглабэлі, Астапа Вішні, Дасьвітнага, Бухнікашвілі, Жгэнці, Алеся Карнейчука, Днепроўскага, Шутава; аўтар п'есы Андрэй Александровіч, а таксама вялікая дэлегацыя беларускіх пісьменьнікаў — Крапіва, Харык, Баранкін, Броўка, Хведаровіч, Зарэцкі і інш.

Гэты вечар ператварыўся ў дэманстрацыю росту нацыянальнага пралетарскага мастацтва БССР, у вечар ушанаваньняў і творчых перамог Андрэя Александровіча ў сувязі з 10-гадовым юбілеем і пастаноўкай яго першай п'есы.

Для БДТ-2 прэм'ера «Напор» зьяўляецца новай перамогай у стварэньні баявога, высока-мастацкага і ідэйна-насычанага, дасканалага рэвалюцыйнага рэпэртуару, спэктаклю.

ЗРЫУШЧЫКІ ФІНПЛЯНУ

Замест рапарту XIV зьезду КП(б)Б аб поўным выкананьні студзеньскага заданьня па фінпляне ніжэйпаказаныя раёны на 20-1 1932 г. выканалі:

1. Расонскі — 26,1 проц.
2. Крычаўскі — 25,2 проц.
3. Буда-Кашалёўскі — 24,7 проц.
4. Талачынскі — 24,5 проц.
5. Бешанковіцкі — 23,8 проц.
6. Чырвонапольскі — 23,5 проц.
7. Бярэзінскі — 23 проц.
8. Асьвейскі — 22,1 проц.
9. Бягомльскі — 22 проц.
10. Жлобінскі — 22 проц.
11. Чавускі — 22 проц.
12. Хойніцкі — 18,6 проц.
13. Чырвона-Слабодзкі — 18 проц.
14. Гарадоцкі — 17,6 проц.
15. Шклоўскі — 17,4 проц.
16. Лельчыцкі — 15,7 проц.

Што скажуць зьезду КП(б)Б сакратары райкомаў гэтых раёнаў?

НАРКАМФІН БССР.

Інтэрнацыянальная брыгада пісьменьнікаў у Гомелі

ГОМЕЛЬ, 25. З 22 па 24 студзеня ў Гомелі працавала інтэрнацыянальная брыгада пісьменьнікаў нацыянальных рэспублік Савецкага Саюзу сумесна з групай пісьменьнікаў БССР.

Агульна-гарадзкі вечар творчасьці народаў СССР, які быў наладжан 23 студзеня ў клюбе імя Леніна, праходзіў пры перапоўненай залі і з вялікім уздымам.

СЫПІС таварышоў, мабілізаваных Менгаркомам КП(б)Б у сельсаветы па растлумачэньні закону аб аднаразовым зборы на культурна-жыльлёвыя патрэбы:

Рагуновіч (нарсуд 1 вуч. — Прыгарадны с.-с.), Клябанаў (гарсавет — Калодзішчанскі с.-с.), Калявец (гар. БК — Каралішчавіцкі с.-с.), Даніловіч (ГК КП(б)Б — Астрашыц.-Гарад. с.-с.), Пабітко (ГК саюзу асьветы — Бараўскі с.-с.), Шотт (ГК КП(б)Б — Папгайскі с.-с.), Якубовіч (гарсавет — Абчацкі с.-с.), Бронштэйн (райкалгасьсаюз — Трасьцянецкі с.-с.), Балянскі (райкалгассаюз — Н.-Дворскі с.-с.), Шэлег (МТС — Папярнянскі с.-с.), Шапятка (гарснаб — Заслаўскі с.-с.), Зархін (гарпрофшэфства — Грычанскі с.-с.), Кудраеў (ГОНС — Самахвалавіцкі с.-с.), Бельскі (ГК КП(б)Б — Кайкаўскі с.-с.), Герчыкаў (ГК КП(б)Б — Сеньніцкі с.-с.). Шалкавец (гарсавет — Строчыцкі с.-с.), Мінц (ГК КП(б)Б — Гатаўскі с.-с.), Каган (пракуратура — Ратамскі с.-с.).

Выклічаныя таварышы павінны зьявіцца на нараду ў гарком КП(б)Б, сала пасяджэньняў, 26-га студзеня 1932 г., у 2 гадзіны дня.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Да ведама праўленьняў калгасаў.

ІНСТРУКТАЖ

вылучаных праўленьнямі калгасаў вучотчыкаў жывёлы і павозак будзе праводзіцца ў сельсаветах або ў тых пасёлках, якія назначаны сельсаветамі

30-31 студзеня.

Усе вылучаныя вучотчыкі павінны своечасова зьявіцца па загаду сельсавецкай вучотнай камісіі ў той пункт, які будзе назначан для інструктажу сельсаветам.

Рэспубліканская камісія па вучоце жывёлы і павозак.

Да ведама ўсіх саўгасаў.

ІНСТРУКТАЖ

назначаных дырэкцыямі саўгасаў вучотчыкаў жывёлы і павозак будзе праводзіцца ў раённых цэнтрах або ў тых пунктах раёну, якія паказаны раённымі вучотнымі камісіямі

28-29 студзеня.

Усе вылучаныя вучотчыкі саўгасаў павінны зьявіцца без спазьненьня на інструктаж.

Рэспубліканская камісія па вучоце жывёлы і павозак.

Менск, выдавецтва газ. «ЗЬВЯЗДА».

Галоўлітбел № 331.